

ЯК ГЭТА, ЧЫТАЦЬ НАВІНЫ Ў ЭФІРЫ? ЧЫРВОНКА

ДАДАТКОВАЯ АДУКАЦЫЯ МОЖА СТАЦЬ АСНОЎНАЙ ЧЫРВОНКА




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

6 ВЕРАСНЯ 2018 г. ЧАЦВЕР № 171 (28787)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Леанід АНФІМАЎ, старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю:**

*«З 2019 года замест планавых праверак у краіне ўводзіцца новая форма кантролю — выбарачныя праверкі, заснаваныя на сістэме ацэнкі рызыкі ўчынення суб'ектам гаспадарання правапарушэнняў і высокай ступені іх негатыўных наступстваў. Тэма скарачэння праверак суб'ектаў гаспадарання ўжо даўно абмяркоўваецца як у грамадстве, так і ў органах дзяржкіравання. Ажыццяўляць праверкі без дастатковых падстаў — значыць, стрымліваць развіццё бізнесу, дзелавой ініцыятывы. Рызыка-арыентаваны метад праверак заснаваны на тым, ці ёсць у суб'екта гаспадарання патэнцыйныя пагрозы ўзнікнення пазаштатных сітуацый, звязаных з парушэннем заканадаўства ў гаспадарчай і эканамічнай сферах».*

## КОРАТКА

- **МАРГ: інфляцыя па выніках года не перавысіць 6 %.**
- Белкаапсаюз сёлета закупіў у насельніцтва ў сем разоў больш чарніц, чым у 2017 годзе.



- **XIII Беларускі міжнародны медыяфорум «Партнёрства ў імя будучыні: лічбавы парадак для медыяпрасторы» пройдзе 11—14 верасня ў Мінску і Мінскай вобласці.**
- Тэрыторыю Наваполацка плануюць павялічыць за кошт часткі зямель Полацкага раёна.
- **Старыя і пустуючыя дамы ў Беларусі будуць прадаваць па рыначным кошце.**

# Разгарніся, душа!



Пра гарманістаў з вёскі Меркулавічы Васіля КАЗЛОВА і Любоў ГАЛУБІЦКУЮ ведае, бадай, кожны жыхар Чачэрскага раёна. Нягледзячы на адсутнасць прафесійнай адукацыі, яны сталі сапраўднымі віртуозамі ігры на гэтым інструменце і нават папулярнымі артыстамі свайго рэгіёна: без Васіля і Любові не праходзіць ніводнае вясковае свята альбо фестываль. Пра такіх талентаў кажуць: музыкі ад Бога. Нават не верыцца, што яны не ведаюць нот, іграюць толькі на слых і па памяці. Дзякуючы дуэту — а Васіль і Любоў часта разам (як на гэтым здымку) выконваюць народныя найгрышы, песні, танцы — захавалася і «Меркулавіцкая кадрыля», шэдэўр бытавых танцаў Пасожжа.

Васіль Казлоў першы раз узяў у рукі гармонік у пяцігадовым узросце, бо ў бацькоўскім доме было некалькі інструментаў — бацька быў найлепшым гарманістам. Цяпер Васіль Васільевіч працуе акампаніятарам у Меркулавіцкім сельскім Доме культуры.

Любоў Галубіцкая нарадзілася ў Хойніцкім раёне, пасля інстытута прыехала ў Меркулавічы працаваць настаўнікам нямецкай мовы. Пра сваё захапленне гармонікам яна кажа: «У пятым класе я прасіла ў маці купіць мне інструмент, нават плакала! Купілі толькі ў сёмым, калі мне ішоў чатырнаццаты год». Цяпер Любоў Аляксандраўна на пенсіі, але як музыкант працуе ў Музеі хлеба ў суседняй вёсцы.

Мне пашанцавала паслухаць, як меркулавіцкія гармасісты выконваюць беларускія пабытавыя танцы: «картузэ», «суботу», «матлёт», «на рэчаньку», «карапэт», «базар», «падэспань», «чачэрскую польку». І вядома, сямікаленную «меркулавіцкую кадрылю».

**На сайце www.zviazda.by можна пагладзець і паслухаць гармонікі Васіля Казлова і Любові Галубіцкай і атрымаць сапраўднае задавальненне.**

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

■ 50+

# Задача — падрыхтаваць да пенсіі...

## Цэнтр сацыяльных праектаў хоча аб'яднаць бізнес і клопат пра людзей

**Што мы робім, калі сутыкаемся з якой-небудзь сацыяльнай праблемай, няхай гэта будзе распаўсюджванне наркаманіі, складанасці з працаўладкаваннем для людзей з інваліднасцю або экалагічныя праблемы? Яшчэ ў пачатку мінулага года Міжнароднае агенцтва сацыяльных і маркетынгавых даследаванняў (МАСМД) правяло апытанне жыхароў беларускіх гарадоў. Аказалася, больш за палову гараджан (62,8 %) лічаць, што трэба звяртацца ў дзяржаўныя органы, якія павінны вырашыць дадзеную праблему. І вельмі многія з гэтых больш чым 60 % апытаных іншых шляхоў папросту не бачаць.**

СТАР. 13

«Звязда» працягвае друкаваць матэрыялы ў падтрымку адкрыцця ў пасёлку Глуша Бабруйскага раёна музея, прысвечанага творчасці Алеся Адамовіча

# З днём нараджэння, Алесь Міхайлавіч!

**Трэццяга верасня ў Беларусі адзначылі памятную дату, прысвечаную вядомаму пісьменніку.**

— Бацька вельмі любіў збіраць у сябе дома гасцей, — так згадвае **Алеся Адамовіча яго дачка Наталля.** Пісьменнік ніколі не ўжываў спіртнога, піў замест яго малако ці кефір і «п'янеў» ад стасункаў з цікавымі яму людзьмі.

— Мы загадзя рыхтаваліся да свята, ішлі на базар, куплялі там усё, чым можна было парадаваць гасцей, — кажа Наталля. — У сямейным коле адзначалі дзень нараджэння 3 жніўня, калі бацька з'явіўся на свет. А вось афіцыйна святкавалі менавіта 3 верасня — дата, якую прыдумала для яго маці, каб выратаваць ад згону ў Нямеччыну. Яшчэ і памаладзіла сына на год.

У госці да Алеся Міхайлавіча на яго мінскую кватэру прыходзілі блізкія сябры, тыя, з кім ён быў знаёмы па інстытуце, творчым жыцці. Жаданым госцем быў пісьменнік Васіль Быкаў, з якім вельмі сябраваў Адамовіч. Прыходзіў ветэран вайны, паэт Навум Кіслік, з якім яшчэ зусім малады Алесь вучыўся на філфаку, паэт, перакладчык Валянцін Тарас, вядомы фотамайстар Яўген Коктыш, мастацтвазнаўца Уладзімір Бойка, на адзін з юбілеяў завіталі кінарэжысёр-дакументаліст Віктар Дашук і сакратар ЦК Кампартыі Беларусі па ідэалогіі былы лётчык Аляксандр Кузьмін, які падтрымліваў Адамовіча і Быкава. Заўсёды прыходзіла шмат сваякоў з боку Адамовічаў і Тычын.

Тыя імгненні засталіся ў сямейным альбоме разам з выразкамі з літаратурных часопісаў і газет, дзе Алеся Адамовіча сардэчна віншавалі калегі.

СТАР. 13

ISSN 1990 - 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПАДПІШЫСЯ І ВЫЙГРАЙ КАРЫСНЫЯ ПРЫЗЫ!

Ідзе падпіска на «Звязду» на IV квартал 2018 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# УЗОРЫ ПРАФЕСІЯНАЛІЗМУ

**Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ аб прысуджэнні дзяржаўных узнагарод 120 прадстаўнікам розных сфер дзейнасці.**

Такой высокай ацэнкі яны ўдастоены за шматгадовую плённую працу, высокі прафесіяналізм, узорнае выкананне службовых абавязкаў, смелыя і рашучыя дзеянні ў абставінах, звязаных з рызыкай для жыцця, вялікі асабісты ўклад у развіццё прамысловасці, сельскагаспадарчай і будаўнічай галін, значныя дасягненні ў сферах гандлю, сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, адукацыі, культуры, мастацтва і спорту, паведаміла прэс-служба беларускага лідара.

Начальнік вучэбна-спартыўнай установы «Мінскі аэраклуб імя двойчы Героя Савецкага Саюза С. І. Грыцаўца» рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «Добраахвотнае таварыства садзейнічання арміі, авіяцыі і флоту Рэспублікі Беларусь» Мікалай Мачанскі быў узнагароджаны ордэнам «За асабістую мужнасць».

Ордэнам Пашаны ўзнагароджаны дырэктар ААТ «Астрамечава» Алег Бурак, дырэктар ААТ «Веста» Рэйман Веньямінаў, дырэктар віцебскай гімназіі № 8 Раіса Грабоўская, старшыня вытворчага сельскагаспадарчага каапературыва «Гігант» Міхаіл Левакоў, дырэктар ААТ «Новыя Гараны» Віссарыён Нам і дырэктар РСУП «Эксперыментальная база «Крынічная» Мікалай Рубаха.

Ордэн Францыска Скарыны атрымала старшыня Віцебскага абласнога аддзялення грамадскага аб'яднання «Саюз пісьменнікаў Беларусі» Тамара Гусачэнка. Многія з узнагароджаных атрымалі медалі, сярод іх — «За адзнаку ў воінскай службе», «За адзнаку ў ахове грамадскага парадку», «За працоўныя заслугі», і медалі Францыска Скарыны.

Медалём «За выратаванае жыццё» ўзнагароджаны ваенны камісар Смаргонскага раёна падпалкоўнік Леанард Гружэўскі і навучэнец Мінскага дзяржаўнага прафесійнага ліцэя № 9 аўтамабілебудавання ВітальЦіток.

Дарэчы, указам прысвоены ганаровыя званні Рэспублікі Беларусь прадстаўнікам сфер культуры, навукі, адукацыі, сацыяльнай абароны, прамысловасці, сельскай гаспадаркі, будаўніцтва, энергетыкі, праваахоўнай сферы і спорту.

## Тэлефон пытанняў і адказаў

**Традыцыйныя прамыя тэлефонныя лініі пройдуць і ў гэтую суботу, 8 верасня. У аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме на званкі будуць адказваць з 9.00 да 12.00:**

кіраўнік спраў БРЭСЦКАГА аблсавета дэпутатаў Георгій Мікалаевіч ХВАЛЬКО. Тэл. 8 016 221 31 21;

намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Уладзімір Мікалаевіч БЕЛАВУС. Тэл. 8 021 222 22 22;

старшыня ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Уладзімір Андрэевіч ДВОРНІК. Тэл. 8 023 233 12 37;

намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Уладзімір Іосіфавіч ДЗЯШКО. Тэл. 8 015 273 56 44;

намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Віктар Уладзіміравіч НЕКРАШЭВІЧ. Тэл. 8 022 250 18 69;

кіраўнік спраў МІНСКАГА аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ГУРЫНОВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;

намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Аляксандр Пятровіч КРЭПАК. Тэл. 8 017 222 44 44.

■ Парламенцкі дзённік

# УМАЦАВАННЕ ЎСХОДНЯГА ПАРТНЁРСТВА

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Дзмітрый ШАЎЦОЎ выступіў з дакладам на пленарным пасяджэнні 39-й Генеральнай асамблеі Міжпарламенцкай асамблеі Асацыяцыі дзяржаў Паўднёва-Усходняй Азіі (МПА АСЕАН), якая праходзіць у гэтыя дні ў Сінгапуры.**

Даклад беларускага парламентарыя адпавядаў асноўнай тэматыцы асамблеі «За ўстойлівую і інавацыйную супольнасць», паведамляе прэс-служба Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі. Дэпутат падкрэсліў, што Рэспубліка Беларусь ужо мае рэпутацыю незалежнага і эканамічна важнага партнёра ў сваім рэгіёне. Усе стратэгіі і праграмы, прынятыя на дзяржаўным узроўні, а таксама міжнароднае супрацоўніцтва накіраваны на падтрымку інавацый, прыцягненне замежных інвестараў і паляпшэнне ўмоў вядзення бізнесу на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Эканамічная сістэма Рэспублікі Беларусь зацікаўлена ў будаўніцтве і развіцці інавацыйных і высокатэхналагічных вытворчасцяў, прадукцыя якіх будзе паспяхова рэалізоўвацца на знешніх рынках.

Беларускі парламент высока цэніць узаемадзеянне з парламентамі дзяржаў Паўднёва-Усходняй Азіі, якое развіваецца, і разглядае паглыбленне партнёрскіх сувязяў з МПА АСЕАН у якасці аднаго з прыярытэтных напрамкаў знешняй палітыкі Беларусі, падкрэсліў Дзмітрый Шаўцоў.

Рэспубліка Беларусь разглядае краіны Паўднёва-Усходняй Азіі як надзейных партнёраў у барацьбе з сучаснымі выклікамі і пагрозамі і гатова дзяліцца вопытам, абменьвацца навуковым і інавацыйным патэнцыялам для дасягнення ўстойлівага развіцця і стабільнасці, дадаў беларускі дакладчык.

У рабоце сесіі асамблеі прымае ўдзел каля 300 парламентарыяў з 10 краін — удзельніц АСЕАН (Брунеі-Дарусалам, В'етнам, Інданезія, Камбоджа, Лаос, Малайзія, М'янма, Сінгапур, Тайланд, Філіпіны), а таксама з дзевяці парламентаў-назіральнікаў (Аўстралія, Беларусь, Усходні Тымор, Індыя, Кітай, Новая Зеландыя, Расія, Японія, Еўрапейскі парламент).

У рамках мерапрыемстваў сесіі Дзмітрый Шаўцоў правёў сустрэчы са старшынёй парламента Рэспублікі Сінгапур, старшынёй МПА АСЕАН Тан Чуан-Джынам, старшынёй Нацыянальнага сходу Лаоскай Народна-Дэмакратычнай Рэспублікі Пані Ятхоту, намеснікам старшыні парламента Усходняга Тымора Марыяй Ангелінай Лопез Сармента і міністрам юстыцыі Малайзіі Д. Кеонгам.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА**

■ Тры пытанні да ўлады

# ПРЭМІЯ ЗА ПРЫГАЖОСЦЬ

**Краснаполле за апошні час прыкметна папрыгажэла. На вуліцах раённага цэнтра чысціня, шмат кветкавых кампазіцый, пасвяжэлі фасады, рамантуюцца дарогі. Адчуваецца, што да навядзення парадку тут ставяцца з поўнай адказнасцю. А яшчэ вельмі трапятліва адносяцца да сваіх нацыянальных каштоўнасцяў і робяць усё для іх адраджэння і папулярызацыі. Тут знаходзяцца шыкоўны гісторыка-этнаграфічны музей, унікальныя культавыя помнікі, славутасці прыроднага значэння. Трэба, каб усё гэта функцыянавала і прыцягвала як мага больш наведвальнікаў, лічаць у раёне. Пра тое, што робіцца на Краснапольшчыне ў рамках Года малой радзімы, у нашай размове са старшынёй райвыканкама Ігарам БАЛАХОНАВЫМ.**



**— На тэрыторыі Краснапольскага раёна знаходзіцца некалькі культавых аб'ектаў і святых крыніц, куды прыязджаюць паломнікі з усяго свету. Што робіцца для таго, каб падтрымаць гэтую прыгажосць у належным стане?**

— Нядаўна нашым лясгасам была добраўпарадкавана тэрыторыя з зонай адпачынку і купеллю каля вёскі Выдранка, непадалёк ад мяжы з Гомельскай вобласцю. Вёска, дарэчы, вядомая тым, што там знаходзіцца ўнікальны драўляны храм у гонар Святога Дзмітрыя Растоўскага — сёлета яму спаўняецца 113 гадоў. Кажуць, храм пабудаваны без адзінага цвіка. Зараз па ініцыятыве дэпутацкага корпуса праводзяцца работы па добраўпарадкаванні помніка мясцовага значэння ўрочышча Касцёл. Па лініі Глабальнага экалагічнага фонду ў рамках рэалізацыі праекта «Майстэрня мясцовых экалагічных ініцыятыў для развіцця мікрарэгіёна» выдзелены грошы, на якія набыты ацыліндраваны брус для далейшага ўладкавання купелі. У маі быў праведзены дзень бязвыплатнай працы, сродкі ад якога былі накіраваны на добраўпарадкаванне гэтай тэрыторыі. Зараз вядуцца работы па ўзвядзенні купелі.

**— Вакол «Іванавага хутара», дзе расце шмат рэдкіх для Беларусі дрэў і кустоў, у свой час было шмат размоў. Яго стваральнік 88-гадовы Іван Зотаў хваляваўся, што няма пераемніка. Зараз, чула, знойдзена выйсце са складанага становішча.**

— Так. У рамках яшчэ аднаго праекта на тэрыторыі Яноўскага сельсавета рэалізуецца ініцыятыва «Экатур у Шангры-Ла», што ў перакладзе азначае «райскі куток». Гэта якраз і ёсць той самы «Іванаў хутар» у вёсцы Брылёўка — дэндралагічны сад мясцовага значэння. ЮНЕСКА прызнала яго ўнікальным прыродным аб'ектам. Праект прадугледжвае там развіццё экатурызму. На дадзены момант вядуцца работы па добраўпарадкаванні і выдаленні пажухлай раслціннасці. Прадугледжана будаўніцтва агароджы і малых архітэктурных формаў.

**— У Краснаполлі вядуцца работы па рамонце фасадаў, праведзена замена тратуарнай пліткі. І гэта ў той час, калі райцэнтры скардзяцца на фінансавы голад...**

— Сёлета нам былі ўручаны прэміі за прызавыя месцы ў трох конкурсах — двух абласных і адным рэспубліканскім. Сярод населеных пунктаў адпаведнай катэгорыі мы аказаліся найлепшымі ў краіне па добраўпарадкаванні за мінулы год і атрымалі прэмію ў памеры паўтары тысячы базавых велічынь. Плюс 225 «базавых» нам далі па выніках спаборніцтва па сацыяльна-эканамічным развіцці сярод гарадоў і раёнаў Магілёўскай вобласці. І дзве тысячы «базавых» уручылі па выніках абласнога спаборніцтва па санітарным стане і добраўпарадкаванні. Частка сродкаў пайшла на добраўпарадкаванне сквера — закуплены дзіцячыя гульнявыя комплексы, інструмент для падрэзкі раслціннасці. Пэўная сума пойдзе на рамонт будынка, дзе нядаўна за кошт міжнароднай тэхнічнай дапамогі была створана ганчарная майстэрня. Там мы памяняем дах, а вонкавыя сцены будуць абшытыя сайдынгам. Часткова за прэміяльныя вядзецца рамонт дарог райцэнтра.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### ЗША выкарыстоўваюць Сірыю для ўнутрыпалітычнай барацьбы

Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп сваімі заявамі аб Сірыі рашае ўласныя ўнутрыпалітычныя задачы. Такое меркаванне выказаў учора міністр замежных спраў Ірана Махамад Джавад Зарыф.

«Трамп спрабуе лавіць рыбу ў каламутнай вадзе, каб рашыць унутрыпалітычныя задачы. Яго становішча ў ЗША складана назваць устойлівым, і ён спрабуе кампенсаваць гэтую праблему за кошт сірыйскага народа», — прыводзіць словы Зарыфа агенцтва Mehr.

Міністр заклікаў прэзідэнта ЗША «адысці ўбок, каб даць магчымасць працаваць тым, хто змагаецца ў Сірыі з тэрарыстамі». «Калі ніхто не будзе ўмешвацца, то мы хутчэй вырашым праблему экстрэмізму ў краіне», — сказаў ён.

Раней Трамп напісаў у «Твітэры», што прэзідэнт Сірыі Башар Асад «не павінен безразважна атакаваць сірыйскую правінцыю Ідліб». Ён адзначыў, што «рускія і іранцы зробяць вялікую гуманітарную памылку, прыняўшы ўдзел у гэтай патэнцыйнай чалавечай трагедыі».

Ідліб — адзіны буйны рэгіён Сірыі, які на сёння застаецца ў руках незаконных узброеных фарміраванняў.

### Ва Украіне падаюць у суд на спікера Рады



Дэпутат Вярхоўнай рады, лідар партыі «За жыццё» Вадзім Рабіновіч падае ў суд на спікера парламента Андрэя Парубія за «прапаганду фашызму».

Абурэнне дэпутата выклікалі зробленыя напярэдадні ў эфіры аднаго з украінскіх тэлевізійных ток-шоу словы Парубія аб тым, што «трэба вывучаць і ўкараняць на Украіне прамую дэмакратыю, носьбітам якой з'яўляецца Адольф Гітлер».

«З фашыстамі нам не па дарозе. Я заклікаю Еўропу, у прыватнасці Германію, даць ацэнку дзеянням украінскага спікера, і лічу, што ён павінен пайсці ў адстаўку, — адзначыў у гэтай сувязі Рабіновіч. — Я сёння падаю іск у суд на Парубія за прапаганду фашызму, якая забароненая ў нашай краіне».

У аўторак у вячэрняй праграме «Свабода слова» на канале ICTV Андрэй Парубій прывёў Адольфа Гітлера ў прыклад як сапраўднага прыхільніка дэмакратыі. «Я сам велізарны прыхільнік прамой дэмакратыі, я калісьці нават на навуковым узроўні гэтым займаўся. Дарэчы, скажу вам, што самым вялікім чалавекам, які практыкаваў прамую дэмакратыю, быў Адольф Алаізавіч (Гітлер — **рэд.**) у 30-х гадах. Мы павінны пра гэта таксама памятаць», — заявіў спікер украінскага парламента.

### Трамп заявіў, што цытаты ў кнізе журналіста The Washington Post сфабрыкаваныя

Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп назваў у аўторак сфабрыкаванымі цытаты ў кнізе члена рэдкалегіі газеты The Washington Post Боба Вудварда «Страх. Трамп у Белым доме». Такое паведамленне амерыканскі лідар апублікаваў у «Твітэры».

Ён прыводзіць заявы міністра абароны Джэймса Мэтціса і кіраўніка апарату супрацоўнікаў Белага дома Джона Кэлі, у якіх яны абвяргаюць прыпісаныя ім у кнізе цытаты. «Іх цытаты былі сфабрыкаваныя, гэта падман грамадскасці. Як і іншыя гісторыі і цытаты ў гэтай кнізе», — напісаў Трамп.

Як стала вядома раней, у кнізе Вудварда, якая паступіць у продаж 11 верасня, расказваецца аб рабоце адміністрацыі Трампа. У ёй таксама гаворыцца, што прэзідэнт ЗША аддаваў Пентагону ў 2017 годзе эмацыянальны загад аб знішчэнні прэзідэнта Сірыі Башара Асада, аднак Мэтціс не стаў выконваць гэтае распараджэнне.

Таксама паведамляецца, што кіраўнік апарату супрацоўнікаў Белага дома Джон Кэлі ў гутарцы з калегамі назваў Трампа ідыётам, заявіў, што той «страціў розум». Акрамя таго, у тэксце гаворыцца, што праз месяц прэзідэнцтва Трамп папрасіў старшыню Камітэта начальнікаў штабоў узброеных сіл ЗША генерала Джозэфа Данфарда распрацаваць план нанясення прэвентыўнага ўдару па КНДР, што ашаламіла ветэрана баявых дзеянняў.

■ Супрацоўніцтва

# НОВЫЯ ГАРЫЗОНТЫ «БЕЛАРУСА»

**У Таджыкістане на прадпрыемстве «Агратэхсэрвіс» будзе створаны кластар па зборцы беларускай тэхнікі**

**«Цяпер збіраюцца толькі дзве маркі трактароў «Беларус». У будучыні там плануецца зборка не толькі тэхнікі Мінскага трактарнага завода, а і іншай сельскагаспадарчай, камунальнай тэхнікі. Маецца на ўвазе: усё, што ствараецца ў Беларусі, можна там на базе па меры неабходнасці сабраць. Такая перспектыва гэтага прадпрыемства на будучыню», — расказаў «Звяздзе» Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Таджыкістана ў Беларусі Хакдод Махмадшарыф Махмуд.**

«Агратэхсэрвіс» займаецца кааперацыйнай вытворчасцю трактароў «Беларус» у таджыкскім горадзе Гісар. Удзел у яе адкрыцці ў маі гэтага года прымалі кіраўнікі дзвюх дзяржаў. Падчас гэтага ж візіту Аляксандр Лукашэнка даручыў стварыць праграму адукацыі таджыкскіх машынабудаўнікоў на МТЗ. І ўжо ў канцы жніўня першы работнік Самардзін Джабараў пасля месячнага курса атрымаў сертыфікат ліцейшчыка металаў і сплаваў.

Асаблівыя словы падзякі ад спецыяліста з Таджыкістана — кіраўніцтву завода і калегам, якія працавалі ў цэху поруч і дапамагалі спасцігаць новыя ўменні.

Першы намеснік генеральнага дырэктара МТЗ Тарас Мурог адзначыў, што на заводзе высока ацэньваюць вынікі праведзенай працы і плануюць далей запрашаць спецыялістаў «Агратэхсэрвіса» на навучэнне.

«Зборка, адкрытая ў горадзе Гісар пры ўдзеле прэзідэнтаў Беларусі і Таджыкістана, адкрывае высокі патэнцыял для ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва і дазваляе вывесці яго на новы ўзровень, — падкрэсліў Тарас Мурог.

**Марыя ДАДАЛКА**

■ Сталічныя навіны

# ДОБРА ПАПРАЦАВАЛІ — ДОБРА АДПАЧНЁМ

**Дзень горада пройдзе ў Мінску 8—9 верасня**

**Сёлета беларускай сталіцы споўніцца 951 год — сур'ёзная лічба. З якімі эканамічнымі паказчыкамі сустракае горад гэтае свята?**



Па словах Таццяны Краўчанкі, першага намесніка старшыні камітэта эканомікі Мінгарвыканкама, сталіцы ёсць чым ганарыцца. У Мінску, параўнальна невялікай па плошчы «кропцы» на карце краіны, фарміруецца трэцяя частка ВУП краіны і палова яе бюджэту. Менавіта сталіца дае 70 працэнтаў актыўнага тавараабароту, 70 працэнтаў экспарту паслуг, 40 працэнтаў экспарту тавараў і каля 30 працэнтаў рознічнага тавараабароту.

Валавы рэгіянальны прадукт (ВРП) Мінска супастаўны з ВРП дзвюх сумежных абласцей. Горад другі год запар забяспечвае станоўчую дынаміку і выходзіць на ўсе зададзеныя ўрадам параметры. Гэта дазваляе зрабіць зачын на датэрміновае выкананне пяцігадовай праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця.

Усё больш інвестыцый укладваецца ў эканоміку горада. Так, інвестыцый у асноўны капітал за сем месяцаў прыраслі больш чым на чвэрць у параўнанні з мінулым годам, тэмп іх росту склаў 127 працэнтаў. Высокі давер і з боку замежных інвестараў, якія ўклалі за першае паўгоддзе 3,7 мільярда долараў у развіццё горада.

А што ж чакае мінчан і гасцей Мінска ў плане культурна-масавых мерапрыемстваў, якія будуць праводзіцца ў рамках Дня горада 8—9 верасня? Трэба прызнаць, праграма намечана шырокая і разнастайная. Па традыцыі напярэдадні свята, 7 верасня, у Палацы культуры прафсаюзаў адбудуцца ўшанаванне мінчан, якія перамаглі ў конкурсе «Найлепшы па прафесіі», і святочны канцэрт майстроў мастацтваў. У Мінскай гарадской ратушы ў гэты дзень пройдзе ўрачыстая цырымонія ўзнагароджвання жыхароў, якія прымаюць актыўны ўдзел у ахове правапарадку і прафілактыцы правапарушэнняў.

Асноўныя мерапрыемствы пройдуць 8 верасня. Святочная праграма пачнецца ў 10.00 з ускладання кветак да абеліска «Мінск — горад-герой». У гэты ж дзень у Мінскім гарадскім Палацы культуры ўзнагародзяць лаўрэатаў конкурсу «Мінчанін года» ў 13 намінацыях.

На тэрыторыі каля Палаца спорту ў суботу, 8 верасня, з 9.00 разгорнецца вялікае фізкультурна-спартыўнае свята. Пройдуць спаборніцтвы сярод пажарных-ратавальнікаў, а ў другой палове дня — маладзёжны опэн-эйр, дзе выступяць выканаўцы розных жанраў і кірункаў. Канцэрт працягнецца да 23.00. Пасля адбудзецца музычнае піратэхнічнае феерверк-шоу.

На тэрыторыі Верхняга горада з 12.00 да 23.00 пройдзе сямейнае свята. Тут плануецца рэалізаваць праект «Мінск — горад прыгажосці». У ім возьмуць удзел Нацыянальная школа прыгажосці, мадэльныя агенцтвы (у тым ліку дзіцячыя), стылісты, візажысты, фларысты. Свае калекцыі прадставяць беларускія дызайнеры. Таксама 8 верасня ў парку экстрэмальных відаў спорту (вул. Сталетава, 1) з 12.00 будзе арганізаваны маладзёжны фестываль.

9 верасня ў парку Перамогі адбудзецца Дзень танкіста і пройдзе Мінскі паўмарафон.

На вуліцы Касманаўтаў 9 верасня адкрыюць памятны знак героям космасу. Аўтар — народны мастак Беларусі, скульптар Іван Міско, архітэктар — Валерый Мітрафанаў. Падзея прымеркавана не толькі да Дня горада, але і да правядзення Міжнароднага касмічнага кангрэса, які будзе праходзіць у гэтыя дні ў Мінску. На скрыжаванні праспектаў Пераможцаў і Машэрава на працягу двух дзён (8 і 9 верасня) можна будзе наведаць фестываль «Мінск старажытны».

Гэтыя і іншыя святочныя мерапрыемствы пройдуць ва ўсіх раёнах сталіцы. Сума не будзе дакладна. Кожны знойдзе сабе занятак па сваіх інтарэсах. А чаму б і не пацешыцца ў такі выдатны дзень?

**Сяргей КУЛАКОЎ**

■ Стыхія

# Прычына пажараў — восеньскія навальніцы

**У Гродзенскай вобласці адбыліся тры пажары з-за ўдараў маланкі, паведамілі ў Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях.**

Ноччу ў 1.49 навагрудскія ратавальнікі прынялі паведамленне аб пажары ў вёсцы Руда. Як расказала 80-гадовая гаспадыня, у гэтую ноч яна прачнулася ад удару маланкі, разбудзіла сына, і яны разам пакінулі дом. Крыху больш за паўгадзіны пайшло ў работнікаў МНС на барацьбу з полымем. У выніку пажару пашкоджаны сцены, знішчаны дах, перакрыцце, маёмасць у доме. Прыкладна ў гэты ж час гарэлі гаспадарчыя пабудовы ў вёсцы Пацавічы Іўеўскага раёна і ў вёсцы Намейкі Шчучынскага раёна. У хлявах знішчаны дахі, пашкоджаны сцены. У абодвух выпадках найбольш магчымая прычына пажару — прамая сіл прыроды (удар маланкі).

У 3.26 ратавальнікам паступіла паведамленне пра пажар у вёсцы Малькі Браслаўскага раёна. На месцы высветлілася, што ў выніку навальніцы і пападання разраду маланкі абрынулася кладка дома, разбіліся вокны, разбураны франтон, пашкоджана печ і маёмасць. Агню ў момант прыезду ратавальнікаў не назіралася. Пацярпелых не было. Жыллё непрыдатнае для далейшага пражывання, сям'я часова спынілася ў родных.

Па звестках МНС, з пачатку года ў зводках ратавальнікаў больш за 90 пажараў звязаны менавіта з праявай сіл прыроды.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

# «...Каб не забыцца, хто мы на гэтай зямлі»

**На стале ў мяне — каторы год, каторае дзесяцігоддзе — адно і тое ж выданне.**

Перш за ўсё таму, што яно, маё, выходзіць на роднай беларускай мове, мове маіх продкаў, якія іншай не ведалі; таму, што яно сапраўды беларускае, бо мова — самы важкі, самы неацэнны набытак народа. Больш за тое, я перакананы, што этнічны беларус без роднай мовы — гэта нешта неакрэсленае, згубленае ў сусвеце, альбо разгубленае...

«Звязда» кожнай сваёй старонкай дае зразумець, хто мы на гэтай зямлі. Кожны нумар газеты падобны і не падобны на папярэдні. Назвы рубрык вобразныя, кранальныя, трапныя: «Крынічка», «...Народ на провадзе!», «Так ці не?»... Усе яны міжволі прымушаюць задумацца, нясуць не толькі інфармацыю, але і канкрэтныя парады — аб тым, напрыклад, як паліваць агуркі ці эканоміць грошы.

Кожны чалавек, незалежна ад узросту, знойдзе на старонках газеты нешта карыснае: прачытае пра апошнія падзеі, здарэнні, пра экалогію, армію, спорт, пра чалавечыя зносіны... І напісана пра ўсё зразумела, змястоўна, з павагай да людзей.

«Звязда» — інтэлігентная газета. Яна дае магчымасць выказвацца чытачам і тым самым становіцца для іх блізкім сябрам. Яна не проста інфарматар, але і настаўнік, дарадца. Чытаеш, напрыклад, рубрыку «Мы разам — Беларусь» і быццам адпраўляешся ў паход: бракуе хіба геаграфічнай карты — для нагляднасці!

Вабіць «Звязда» (калі перайсці на асобы) і першай старонкай — выдатнымі фотаздымкамі ўсюдыіснага Анатоля Клешчука.

Яшчэ ў тыя гады, калі яна пісала пра вёску, наша сям'я літаральна закахалася ў Алену Ляўковіч... А допісы-«карацелькі» Валянціны Доўнар, а нататкі Святланы Яскевіч, Вольгі Мядзведзевай, Надзеі Дрындрожык, Вікторыі Целяшук...

Радуе ў газеце і кожнае новае імя. Значыць, жыве беларускае слова!

...На правах даўняга падпісчыка і настаўніка (хоць і на пенсіі) не ўстрымаюся і ад некалькіх заўваг. Рубрыка «Даты. Падзеі. Людзі» досыць змястоўная: чытаеш і ганарышся, што краіна мае такую багатую гісторыю і столькі выдатных людзей! Але ж вось, радкі, напрыклад, пра Бялыніцкага-Бірулю. Знакаміты мастак! Дык мо, не лішне было б нагадаць і хоць некалькі твораў?

Альбо іншая рубрыка, што заклікае ўсміхнуцца... Ды, бывае, на жаль, што няма з чаго. Часам рэжа вока і недакладнае слова.

Але ж, нягледзячы на заўвагі (магчыма, суб'ектыўныя), скажу, што «Звязду» з паштовай скрынкі заўжды забіраю з хваляваннем: хочацца хутчэй разгарнуць і акунуцца ў чароўны свет роднай мовы.

*Так трымаць, звяздоўцы!*
*Калі не вы, то хто?*

**Леанід КАВАЛЬЧУК,** *г. Жодзіна.*

**P.S. Вы таксама «зноў выбіраеце «Звязду»? І хочаце сказаць чаму? Калі ласка, пішыце! І вядома ж, выпісвайце!**

# СУЧАСНАЕ ГУЧАННЕ

**Рэдакцыя газеты «Советская Белоруссия» перанаваная ў «Выдавецкі дом «Беларусь сегодня». Адпаведнае распараджэнне падпісала кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Наталля Качанава, паведамляе БелТА.**

Такім чынам, працэс удасканалення сістэмы цэнтральных друкаваных СМІ, пачаты ў 2013 годзе з далучэння да рэдакцыі шэрагу рэспубліканскіх выданняў, завершаны. Выдавецкі дом выпускае газеты «СБ. Беларусь сегодня», «Рэспубліка», «Народная газета», «Сельская газета», «Знамя юности». У структуру выдавецкага дома таксама ўваходзяць «Альфа Радио» і інтэрнэт-партал www.sb.by. Сумесна з расійскімі партнёрамі рэалізуюцца праекты «Союз» і «Союзное вече».

«Працэс удасканалення сістэмы друкаваных СМІ — не проста знешняя трансфармацыя. Паралельна ішла вялікая арганізацыйная праца. Бо гаворка ідзе пра вялікі калектыў, высокакваліфікаваныя кадры. Скажу больш: гісторыя нашых выданняў — гэта гісторыя краіны. Напрыклад, наша вядучая газета з'явілася ў далёкім 1927 годзе і першыя 10 гадоў выходзіла пад назвай «Рабочий», а з 1937 года і практычна да нашых дзён называлася «Советская Белоруссия». Цяпер, відавочна, настаў час, каб брэнд, да якога ўжо прывык чытач — «СБ. Беларусь сегодня», — стаў у тым ліку юрыдычным фактам», — паведаміў карэспандэнту БелТА кіраўнік Выдавецкага дома «Беларусь сегодня» Дзмітрый Жук.

Паводле яго слоў, традыцыі, якія склаліся, і рэдакцыйная палітыка будуць працягнутыя. «А менавіта: мы і далей будзем пісаць праўдзівы летапіс нашай цудоўнай зямлі і нашага слаўнага працавітага народа. У гэтым галоўная задача Выдавецкага дома «Беларусь сегодня», — сказаў Дзмітрый Жук.

# КАБ ЖЫВОЕ СЛОВА ГУЧАЛА

## Удзельнікі міжнароднага круглага стала — пра глабалізацыю і наднацыянальнае ў літаратуры

**У межах Дня беларускага пісьменства ў Іванаве прайшоў міжнародны круглы стол «Мастацкая літаратура як шлях адно да аднаго». У ім удзельнічалі творцы з Літвы, Латвіі, Расіі, Украіны, Казахстана, Кыргызстана, Узбекістана і нават Эквадора. Як высветлілася, многіх хвалюе адно і тое ж — працэсы глабалізацыі, якія выклікаюць спрашчэнне і збядненне нацыянальных літаратур. Таксама абмяркоўвалі важнасць перакладаў на іншыя мовы твораў маладых аўтараў, якім так патрэбны такое прызнанне і ўвага. Не засталося па-за разглядам і тое, як прымусіць маладое пакаленне больш чытаць і ўвогуле ці варта? Мадэратарам круглага стала выступіў міністр інфармацыі Беларусі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ. Добра тое, што Дзень пісьменства і міжнародны круглы стол крочаць па краіне, штогод ладзячыся ў розных гарадах, адзначыў ён (гэта становуча ацанілі і ўдзельнікі дыскусіі). Таксама міністр падзякаваў выдавецтву «Мастацкая літаратура», якое спецыяльна да круглага стала падрыхтавала літаратурна-мастацкі альманах «Сугучча. Беларусь — Расія».**



### ВЕРНЫЯ КАРАНЯМ



**Начальнік аддзела па моўнай палітыцы ўпраўлення адукацыі Адміністрацыі гарадской акругі горада Уфы, паэтка Зульфія ХАНАНАВА (Башкартастан):**

— Летась было падпісана пагадненне аб пабрацімстве Уфы і Мінска. У нашай рэспубліцы ёсць цэлы раён, дзе пражываюць беларусы. У вёсцы Балтыка працуе рэспубліканскі гісторыка-культурны цэнтр. Дзеці з пачатковых класаў вывучаюць беларускую мову. А ў бібліятэцы можна пачытаць беларускія кнігі, дзейнічае народны ансамбль «Сябры». Перадаю прывітанне ад беларусаў Башкартастана. Карэннае насельніцтва дагэтуль застаецца верным сваім караням і традыцыям, роднай мове і захавала сваю духоўную і матэрыяльную культуру.

Башкірскіх і беларускіх пісьменнікаў звязвае даўняе сяброўства. Пачынаючы з 1936 года ў нас друкаваліся творы Янкі Купалы, Якуба Коласа, Петруся Броўкі, Максіма Танка, Андрэя Александровіча. А цяпер на башкірскую мову перакладзена аповесць-казка Алеся Карлюкевіча. Я вельмі ўдзячна Марыі Кобец і Валерыі Радунь, якія пераклалі мае асабістыя творы. Думаю, наша ўзаемнае супрацоўніцтва працягнецца, я буду працаваць яшчэ з многімі беларускімі аўтарамі.

Можна казаць пра башкірскую прозу, паэзію, але, на жаль, сучасныя адукацыйныя федэральныя стандарты не дазваляюць у поўнай меры вывучаць родныя мовы. І гэта пагражае знікненню нацыянальнай літаратуры. Нягледзячы на такое становішча, у рэспубліцы робіцца вельмі шмат, каб заахвоціць моладзь да творчасці. У нас праводзіцца папулярны бард-фестываль, выпускаюцца кнігі маладых, ладзіцца тэлепраект, у якім можна выйграць аўтамабіль. Гэта дае свой плён. Я назаву толькі аднаго аўтара, Айгіза Баймухаметава, яму ўсяго 29 гадоў. Нягледзячы на малады ўзрост, яго аповесць «Не пакідай мяне, мама» ўжо перакладзена на многія мовы. Па матывах твора ставяцца спектаклі ў башкірскім і бурацкім тэатрах. Яго кніга, перакладзеная на казахскую мову, прызнаная бестселерам года.



**Літаратуразнаўца, кандыдат філалагічных навук Святлана АНАНЬЕВА (Казахстан):**

— Я вельмі люблю бываць у Беларусі, бо тут так цёпла і шчыра сустракаюць гасцей з многіх краін свету. Ганарымся тым, што казахска-беларускае літаратурнае супрацоўніцтва набыло размах... Нядаўна мы прэзентавалі часопіс «Літаратурная Алма-Ата», у якім прадстаўлены новыя пераклады на рускую мову прозы і паэзіі беларускіх аўтараў. Многія з іх таксама бяруць удзел у круглым стале — гэта і Алесь Бадак, і Юлія Алейчанка. Спадзяюся, што і сённяшняя падзея дасць новы імпульс нашым зносінам — будуць новыя кнігі, будуць даследаванні, навуковыя праекты.

### ПЕРАКЛАДЧЫК ЯК КУЛЬТУРНЫ ПАСЯРЭДНІК



**Пісьменніца Давіна ПАСАС (Эквадор):**

— Роля перакладчыка заключаецца не толькі ў распаўсюджванні твораў розных аўтараў. Перакладчык таксама з'яўляецца культурным пасярэднікам, бо менавіта ён збліжае розныя культуры, улічваючы той кантэкст, у якім была створана праца, час яе напісання, біяграфію аўтара, устойлівыя выразы, характэрныя для зыходнай мовы, а таксама іх эквіваленты ў мове перакладу. Вядома, перакладу мы абавязаны пэўным абнаўленнем, уплывам, які аказваюць адны літаратуры на іншыя. Таксама трэба падкрэсліць, што гэта прывяло да пэўнай аднароднасці, да тэндэнцыі ў літаратуры, нават да збяднення яе тэм. Бо ўся навіна, веліч твора часам губляюцца з-за пераймання таго камерцыйнага, што зазвычай прыходзіць з багатых краін. Таму знікае своеасаблівасць. Кажучы пра гэта, я маю на ўвазе нашу ўнікальную, ні на кога не падобную літаратуру — пісьменнікаў, якія маюць уласныя адметнасці, вопыт, абумоўлены месцам жыхарства.

Міжкультурны абмен — гэта калі адна культура даведваецца штосьці пра іншую, і наадварот. Гэта адбываецца насуперак «прысваенню культуры» — я аддаю паняццю шмат увагі, бо нам выпала жыць у эпоху глабалізацыі. Самыя моцныя краіны пануюць на рынку і, адпаведна, у культуры, у той час як больш бедныя засвойваюць чужую музыку, літаратуру, кіно, сродкі масавай інфармацыі, моду, сацсеткі. Гэта прысваенне з'яўляецца нічым іншым, як стратай ідэнтычнасці і самабытнасці культуры гэтых краін, бо яна ўсё болей нагадвае чужую, больш камерцыйную і, адпаведна, больш паспяховую.

### НЕВЕРАГОДНЫ ЯНАЎ ПАЛЕСКІ!



**Паэт, празаік, публіцыст, старшыня грамадскай арганізацыі «Беларусы Расіі» Валерый КАЗАКОЎ:**

— Калі ёсць нацыянальная літаратура, яна сама па сабе глабальная і інтэрнацыянальная. Калі ж яна размытая і не мае сваіх каранёў, не памятае свайго паходжання, сваіх бацькоў і маці, то гэта не зусім тая літаратура, якой яна павінна з'яўляцца насамрэч. Вы можаце прыкідвацца кім пажадаеце, але ўсё адно маеце карані, а значыць, ваша літаратура і ваша слова таксама маюць гэтыя карані. Праз папяровы носьбіт ці ў сецыве — яна ўсё адно не губляе сваіх якасцяў і вартасцяў, чароўнасці і таленту таго аўтара, які яе напісаў.

Я вельмі рады прысутнічаць на свяце беларускага пісьменства. І разумею, што дзякуючы міжнароднаму кругламу сталу беларускі Дзень пісьменства робіцца глабальным, як і ўсялякая добрая літаратурная рэч заўсёды выходзіць за межы нацыянальнай культуры.

Калі я дабіраўся сюды, зразумеў, што сучаснае Іванава з'явілася толькі 30—40 гадоў таму. А дагэтуль быў Янаў Палескі. Неверагодна прыгожая назва! Я вас вітаю ў Янаве Палескім, і вельмі рады, што адкрыў яго для сябе. А за некалькі кіламетраў ад музея Напалеона Орды, дзе мы праводзім круглы стол, знаходзіцца радавое гняздо Дастаеўскіх — Дастоева. Да якой літаратуры можна аднесці Дастаеўскага — да рускай ці беларускай? А да якой Гогаля — да рускай ці ўкраінскай?..

### ДЗЕЦІ НЕ ЧЫТАЮЦЬ, БО НЕ ЧЫТАЮЦЬ БАЦЬКІ



**Публіцыст, журналіст Талантбек ДЖУМАБАЕЎ (Кыргызстан):**

— Як вядома, глабалізацыя носіць аб'ектыўны характар. Аднак кіраваць ёй спрабуюць з дапамогай суб'ектыўных фактараў тыя структуры, якія маюць магчымасці і сродкі прымаць рашэнні ў сусветным маштабе. Як кажуць спецыялісты, працэс глабалізацыі ў канчатковым выглядзе не прадугледжвае захавання нацыянальных дзяржаў і культур. Гэта працяглы працэс, які ўжо дае плады. Вы выдатна ведаеце, што ў краінах СНД вырасла частка моладзі, якая шмат у чым амерыканізаваная. Глабалізацыя зазвычай навязвае адну культуру, як правіла, маскультуру са сваімі каштоўнасцямі, прынцыпамі — забаўляйся, багацей, думай толькі пра сябе, будзь больш свабодным і гэтак далей. Ці можна гэтаму супрацьстаяць? Так, можна і трэба. Нам усім, удзельнікам СНД, трэба аб'ядноўвацца.

Часта кажуць, што моладзь сёння мала чытае. Гэта так. Але яе не трэба ўгаворваць рабіць гэта... Трэба прымушаць, нават падманваць. З дзяцінства, з садкоў, са школ прывучаць дзяцей да чытання. Гэта працэс не хуткі, але іншага выйсця ў нас няма.

Я другі раз у Беларусі і даведаўся, што тут ёсць вялікія праграмы правядзення літаратурных мерапрыемстваў, супрацоўніцтва, перакладаў. У Кыргызстане існуюць аналагічныя праграмы. Праўда, з-за розных прычын маштабы ў нас меншыя і вынікі больш сціплыя. Аднак яны ёсць, і я вельмі рады, што Кыргызстан і далей будзе яшчэ больш супрацоўнічаць з Беларуссю і з іншымі краінамі СНД ва ўзаемным перакладзе кніг.



**Галоўны рэдактар часопіса «Нёман», намеснік дырэктара Выдавецкага дома «Звязда» Аляксей ЧАРОТА (Беларусь):**

— Любая літаратура з'яўляецца наднацыянальнай. Бо яна ўвабрала ў сябе ўсе дасягненні папярэдняй сусветнай літаратуры.

На маю думку, цікавасць да літаратуры павінна закладвацца ў дзяцінстве. Гэта вялікая праблема, што нашы дзеці сёння не чытаюць. Яна вынікае з таго, што іх не прывучаюць з дзяцінства. Калі яны з паўгода, года будуць бачыць маму, тату ці бабулю, якія чытаюць ім кнігу, думаю, чытанне закладзецца ўжо на падсвядомым узроўні і не будзе неабходнасці іх прымушаць чытаць. Таму ўся праблема ў выхаванні — яны мала бачаць дарослых з кнігамі ў руках.

Так, кніга з папяровага носьбіта з часам пераходзіць у электронны — думаю, яна і далей будзе выходзіць у абодвух варыянтах. Аднак папяровая кніга застанецца, і застануцца людзі, якія будуць яе чытаць.

### ПРАБЕЛ У ВЕДАННІ 1920—1930-х ГАДОЎ



**Пісьменнік, галоўны рэдактар часопіса «Роман-газета» Юрый КАЗЛОЎ (Расія):**

— Мы выпусцілі спецыяльны нумар «Роман-газеты», прысвечаны сучаснай беларускай прозе. Было б добра зрабіць спецыяльны выпуск маладой беларускай літаратуры. Важна казаць пра тое, што сучасных маладых аўтараў перакладаюць вельмі мала — неабходна рабіць гэта часцей.

Ёсць у Расіі вялікі прабел і ў веданні беларускай літаратуры 1920—1930-х гадоў: у савецкі час усё гэта замоўчвалася. Але ж у той перыяд былі цудоўныя пісьменнікі, якія моцна пацярпелі. Гэта літаратура амаль не перакладаецца і невядомая рускаму чытачу. Думаю, трэба рухацца і ў такім кірунку.

Добра, што Дзень беларускага пісьменства праводзіцца ў невялікіх гарадах — атрымліваецца сапраўднае свята для людзей. Калі яны судакранаюцца з тымі, хто прадстаўляе культуру розных краін, кажа пра кнігі, пра чытанне, пра культуру і мастацтва, — пасля такога мяняецца стаўленне да кнігі. Я ўпэўнены, што пасля дзён беларускага пісьменства наведвальнікаў у вашых кнігарнях робіцца нашмат больш. Таму гэта свята для тых, хто любіць літаратуру, хто яе робіць і хто чытае.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
**Фота Яніны ГАРАДЗЕЦКАЙ.**

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

6 ВЕРАСНЯ 2018 г.
ЧАЦВЕР
№ 17 (15848)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

*Імёны*



## Вольга ЖАЛЕЗКАЯ:

# «ПЕРШЫ БУКЕТ БЫЎ... ПЛАСТЫКАВЫ»

**Штодзённыя рэпетыцыі, грым і дэвіз: «Бачу мэту, не бачу перашкод». Менавіта ў такім тэмпе жыве і працуе гэта актрыса Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра. Вольга Жалезкая не толькі таленавітая артыстка і вакалістка, але і вельмі цікавая суразмоўніца. З гутаркі з ёй мы даведаліся шмат пра яе саму, а таксама пра тэатр, у сценах якога і прайшла наша сустрэча.**

***— У вашай сям'і былі творчыя асобы ці вы «першаадкрывальнік» у гэтай сферы?***

— У бацькоў тэхнічныя прафесіі, але ўсе вельмі любяць мастацтва ва ўсіх яго праявах. З самага дзяцінства мы сям'ёй кожны тыдзень хадзілі ў тэатры, на выстаўкі, наведвалі канцэрты. У кампаніі бацькоў былі артысты, так што любоў да музыкі і мастацтва, як той казаў, з «кухонных вячорак». Па расказах маці я ведаю, што бабуля і дзядуля вельмі добра спявалі: ні адно вяселле ці вечарынка, якія ладзіліся ў вёсцы, не абыходзілася без іх. Думаю, што артыстызм, вакальныя даныя, жаданне дарыць свой талент і любоў гледачу ў мяне менавіта ад бабулі. Але без мамінай упартасці і татавай любові, упэўнена, наўрад ці што-небудзь бы атрымалася.

***— Ці памятаеце свой першы букет, падораны ўдзячнымі гледачамі за выступленне?***

— Гэтыя першыя кветкі я ніколі не забуду! Мне было тры гады, на адным з дамашніх мерапрыемстваў, гледзячы на сяброў бацькоў, якія выдатна спявалі, я вырашыла таксама «бліснуць» і праспявала нейкую песню. Усім вельмі спадабалася, мне апладзіравалі, і ў падарунак за выступленне гаспадыня дома паднесла тры пластыкавыя цюльпаны. Вось такі быў мой першы букет. Дарэчы, ён да гэтага часу стаіць дома, нагадваючы аб тым поспеху.

***— А з чаго пачалася ваша музычная адукацыя?***

— Музыкай займаюся з пяці гадоў. Пачынала з гімназіі-каледжа пры Акадэміі музыкі, потым вырашылі, што зручней будзе хадзіць у музычную школу пры музычным каледжы імя Глінкі, якую, дарэчы, я пяць разоў кідала. І толькі ўпартасць мамы і любоў выкладчыкаў не далі мне зрабіць гэта канчаткова. Музычную школу ў выніку скончыла на «выдатна» як піяністка. Потым паступіла ў музычны каледж на спецыяльнасць «дырыжор (акадэмічны хор)», які таксама скончыла на «выдатна».

Наогул з педагогамі ў жыцці ў мяне нейкая неверагодная гісторыя. Я ўсе гады вучобы павінна была быць у зусім іншых выкладчыкаў, але лёс упарта вёў мяне і я аказвалася ў патрэбны час у патрэбным месцы. Далей паступіла ў Беларускую дзяржаўную акадэмію музыкі на вакальную кафедру. ВНУ скончыла зноў жа на «выдатна».

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

*Крок да прафесіі*

# ГЭТА ВАМ НЕ ГУЛЬНІ

## Як аб'яднанні па інтарэсах рыхтуюць да дарослага жыцця?

**Рэспубліканскі тыдзень устаноў дадатковай адукацыі стартаваў 4 верасня. Галоўная яго мэта — пазнаёміць навучэнцаў і іх бацькоў з магчымасцямі гэтых устаноў і іх прапановамі.**

**У час глабальнага развіцця інтэрнэту і камп'ютарных тэхналогій завяваць, а тым больш утрымаць увагу дзяцей і падлеткаў, вельмі праблематычна. Таму многія ўстановы дадатковай адукацыі спрабуюць пераасэнсаваць сваё месца і ролю ў новай сістэме каардынат: мадэрнізуючы традыцыйныя напрамкі, паралельна развіваюць і тое, што сёння знаходзіцца на хвалі цікавасці ў падрастаючага пакалення.**

**Вывучаць прататыпаванне і нейратэхналогіі, займацца 3D-мадэляваннем, інжынерным дызайнам CAD і робататэхнікай, гістарычнай рэканструкцыяй і астраноміяй, канструяваць радыёэлектронныя прылады і кіраваць беспілотнымі лятальнымі апаратамі — вось далёка не поўны пералік заняткаў, якія сёння прапануюць дзецям і моладзі ў Рэспубліканскім цэнтры інавацыйнай і тэхнічнай творчасці.**

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*



**Робататэхніка дапамагае спасцігаць законы фізікі і прынцыпы механікі, развівае творчае мысленне і логіку.**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*Выпрабавана на сабе*

# На хвалі эфіру,

## або Адзін дзень на радыё

**Першая ў гісторыі радыёграма складалася ўсяго з двух слоў — «Генрых Герц». Яе 122 гады таму адправіў рускі навуковец Аляксандр Папоў. Колькі слоў гучыць за дзень у сучасным эфіры, падлічыць немагчыма. Мы завіталі на радыёстанцыю — «Мінская хваля» — і даведаліся, што адбываецца па той бок прыёмніка.**



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

**Карэспандэнт «Чырвонкі. Чырвонай змены» паспрабавала сябе ў якасці радыёвядучай.**

### Хто адказвае за плэй-ліст?

Працоўны дзень на радыё пачынаецца рана. У сем гадзін у эфір выходзіць выпуск навін, і адразу пасля стартуе музычна-забаўляльная праграма. За тое, каб разбудзіць людзей і настроіць іх на рабочы лад, адказвае **вядучы Аляксандр БАРСКІ.**

***— А калі ў вас у самога няма настрою? Што тады?***

— Спачатку спрабую гэта схаваць за бадзёрымі шаблоннымі фразамі, калі не атрымліваецца — заводжу філасофскія размовы, незвычайныя для ранішняга эфіру. Я ж жывы чалавек, мне таксама часам баліць галава.

Ці паспяваюць вядучыя высыпацца? Аляксандр расказвае пра свой графік: кладзецца ў гадзіну ночы, устае ў 5.50. І так на працягу дзевяці гадоў. Арганізм настолькі ўжо прывык, што нават у свае выхадныя суразмоўнік без будзільніка прачынаецца амаль у такі ж час. Але, прызнаецца, што ў доўгай чарзе ў паліклініку ці ашчадкасу можа задрамаць.

Цікавімся, як адбіраецца музыка, што гучыць у эфіры.

— Раней, гадоў дваццаць таму, мае густы ўлічваліся. Ставіў тое, што дазваляла музычная база. Тады я працаваў на іншай радыёстанцыі, і там быў асобны пакой, больш за гэту студыю, дзе захоўвалася дзесяць тысяч дыскаў. Яны стаялі ў шафах, як у бібліятэцы. Гэта быў час рамантыкі, — успамінае Аляксандр.

Цяпер жа плэй-ліст складае музычны рэдактар зыходзячы з таго, якія песні зараз на слыху. На раніцу падбіраюцца дынамічныя кампазіцыі, увечары гучаць больш спакойныя. Удзень ёсць праграма па заяўках, дзе слухачы заказваюць ад Armin van Buuren да Стаса Міхайлава.

Спіс выстройваецца ў пэўным парадку. Гадзіну павінна адкрываць «гарачая» тэма, потым ідуць «астылыя», але пазнавальныя песні мінулых гадоў, а праз дзве-чатыры кампазіцыі — зноў хіт. З папраўкай на мясцовы кантэнт, вядома: 75 працэнтаў музыкі ў эфіры мусіць быць беларускай.

*(Заканчэнне на 5-й стар. «ЧЗ».)*

# ГЭТА ВАМ НЕ ГУЛЬНІ

## МАЗГАВЫ ЦЭНТР ІНАВАЦЫЙ

— Дадатковая адукацыя адыгрывае вельмі важную функцыю, істотна дапаўняючы змест школьнай. Ёй уласцівыя адкрытасць, мабільнасць і гнуткасць, што дазваляе хутка і кропкава рэагаваць на сучасныя адукацыйныя запыты, — падкрэслівае **намеснік дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце цэнтра Ала ГЕРАСІМУК.** — Адна з асноўных задач нашай установы — гэта пабудова зместу дадатковай адукацыі тэхнічнага профілю ў адпаведнасці з сацыяльным заказам. Інавацыйнасць закладзена нават у назве нашага цэнтра. Як толькі мы заўважаем новыя тэндэнцыі, то ўносім змяненні ў змест адукацыі, затым у ходзе эксперыментальнай дзейнасці распрацоўваем праграмнае і метадычнае забеспячэнне новага напрамку. А нашы аб'яднанні па інтарэсах становяцца эксперыментальнымі лабараторыямі, у якіх апрабуюцца новыя вучэбныя праграмы. І ўжо апрабаваны прадукт транслюецца затым на ўсю краіну. Фактычна мы іграем ролю вялікай эксперыментальнай метадычнай пляцоўкі і мазгавога цэнтра.

Хтосьці лічыць заняткі ў гуртках і аб'яднаннях па інтарэсах не больш чым хобі або проста баўленнем часу, але для многіх яны вызначылі прафесійны выбар на ўсё жыццё. І нават калі маладыя людзі ў выніку выбіраюць іншы кірунак сваёй прафесійнай самарэалізацыі, тыя здольнасці, якія яны развівалі ў аб'яднаннях па інтарэсах, абавязкова дапамагаюць ім у іншых сферах.

Установы дадатковай адукацыі ўяўляюць сабой наймагутнейшы рэсурс прафесійнай арыентацыі школьнікаў, папулярызуюць сярод дзяцей і падлеткаў сучасныя прафесіі, даюць магчымасць на практыцы пазнаёміцца з самымі запатрабаванымі прафесійнымі кампетэнцыямі.

## НЕ ПРОСТА МОДА

— Апошнім часам пералік запатрабаваных прафесій пастаянна змяняецца. Сучасны рынак працы патрабуе развіцця інжынернага і прадпрымальніцкага мыслення. Мы не можам гэтага не заўважаць. І калі вызначаем новыя напрамкі, то арыентуемся на міжнародны досвед, у прыватнасці на міжнародны рух JuniorSkill, — тлумачыць Ала Герасімук. — JuniorSkill — гэта праграма ранняй прафарыентацыі і прафесійнай падрыхтоўкі школьнікаў, у рамках якой праводзяцца розныя алімпіяды і спаборніцтвы.

У Беларусі гэты рух развіваецца з 2015 года, і наш цэнтр вызначаны яго каардынатарам. У 2016 годзе ў краіне прайшоў першы Рэспубліканскі конкурс па асновах прафесійнай падрыхтоўкі для школьнікаў ва ўзросце ад 10 да 17 гадоў JuniorSkill Belarus. Пераможцаў выяўлялі ў сямі кампетэнцыях. А ў маі бягучага года адбыўся другі нацыянальны чэмпіянат, дзе былі прадстаўлены ўжо дзесяць кампетэнцый, сярод якіх мабільная робататэхніка, прататыпаванне, інжынерны дызайн CAD, нейрапілатаванне і іншыя.

Конкурс апраўдаў усе надзеі як па колькасці ўдзельнікаў, так і па ўзроўні падрыхтоўкі канкурсантаў і тым энтузіязме, што праявілі дзеці і педагогі. Мы ўпэўнены: праз цікавасць да спаборніцтваў да сучаснага абсталявання можна зацікавіць школьнікаў не толькі высокатэхналагічнай, але і рабочай прафесіяй, можна прадэманстраваць ім, што ў любой з іх абавязкова прысутнічае творчы складнік.

Нейрапілатаванне, інжынернае праектаванне, прататыпаванне, графічны дызайн, мабільная робататэхніка... Пагадзіцеся — гучыць сучасна, але што насамрэч стаіць за кідкімі назвамі? Педагогі, якія курыруюць гэтыя аб'яднанні па інтарэсах у Рэспубліканскім цэнтры інавацыйнай і тэхнічнай творчасці, запэўніваюць, што ніхто не гоніцца за моднымі назвамі, думаюць найперш пра тое, што можа быць карысным для дзяцей у будучыні. Пра гэта яны нам самі і расказалі.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*



Кампетэнцыя «нейратэхналогіі» на спаборніцтвах JuniorSkill Belarus — 2018.

## КАЛІ ХОЧАЦЦА ЛЯТАЦЬ...

**Дзмітрый ЯКАЎЛЕЎ, загадчык кабінета тэхналогій беспілотных лятальных апаратаў і авіямадэлявання:**

— Беспілотныя лятальныя апараты — новы напрамак, які вырас з авіямадэлізму, так бы мовіць, «прасунуты авіямадэлізм». Беспілотнікі — разнавіднасць авіямадэляў, з той толькі розніцай, што яны выконваюць пэўныя прыкладныя задачы ў інтарэсах сельскай, лясной гаспадаркі, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, ваенных ведамстваў і гэтак далей. Таксама яны могуць выкарыстоўвацца і ў забаўляльных мэтах: здымаць спартыўныя, масавыя і іншыя мерапрыемствы...

Канцэпцыя нашай работы складаецца з некалькіх блокаў. Першы — гэта вывучэнне матэрыяльнай часткі: выхаванцы знаёмяцца з рознымі мадэлямі беспілотных лятальных апаратаў, з тым, як яны працуюць, як ажыццяўляецца іх сувязь з зямлёй. Другі блок — стварэнне ўласных мадэляў беспілотнікаў. Мы вучым дзяцей працаваць рукамі, бо не сакрэт, што вырасла пакаленне, якое акрамя як вадзіць пальцам па экране больш нічога не ўмее. Дзеці спачатку ствараюць самыя простыя мадэлі (з паперы, кардону, пенапласту і рознакаляровага скотча), на якіх мы правяраем розныя аэрадынамічныя схемы. Пласкагрудзь, адвёртка... З інструментам трэба ўмець працаваць, а гэтаму ў сям'і не заўсёды вучаць. І трэці складнік — навучанне тэхніцы пілатавання. Запускаць і лятаць — гэта, напэўна, самае цікавае. Сёння прагрэс дазваляе «навучыцца лятаць» на радыёкіраваным самалёце дзякуючы камп'ютару. Ёсць праграмы, якія дазваляюць засвоіць тэхніку кіравання і зразумець, што трэба рабіць, каб твой апарат ляцеў. Яшчэ 15—20 гадоў таму, каб «навучыцца лятаць», выхаванцу трэба было зрабіць 50—60 палётаў з інструктарам, гэта была фактычна работа ў чатыры рукі (адзін абдымаў другога): спачатку інструктар трымаў перадатчык у сваіх руках і кіраваў авіямадэллю, затым наадварот. Такім чынам я «навучыў лятаць» не адну сотню чалавек.

А цяпер у нашай лабараторыі стаяць шэсць камп'ютараў, аснашчаных спецыяльнай праграмай: у памяці змяшчаецца інфармацыя пра 200 мадэляў лятальных апаратаў, але кожны можа закласці характарыстыкі свайго.

На камп'ютары можна адпрацоўваць фігуры найвышэйшага пілатажу, можна лятаць у складзе «двоек», «чацвёрак»... Восенню і зімой мы трэніруемся лятаць у кабінеце, а вясной запускаем свае мадэлі ў паветра. Дзяцей набіраем з дзесяцігадовага ўзросту, але калі размова ідзе пра выхаванцаў нашага цэнтра, якія займаліся ў гуртках ранняга тэхнічнага мадэлявання і ўжо ўмеюць працаваць рукамі, то робім для іх выключэнне.

## ЮНЫЯ КАНСТРУКТАРЫ І ІНЖЫНЕРЫ

**Аляксандр МАСЯЙЧУК, загадчык кабінета 3D-мадэлявання і прататыпавання:**

— Ад слова «прататып» паходзіць назва ўсяго працэсу, у выніку якога з лічбавай мадэлі атрымліваецца гатовы выраб у фізічным вымярэнні. Фактычна размова ідзе пра інжынерна-канструктарскую працу, звязаную са стварэннем прататыпаў (доследных узораў). Раней прататыпы стваралі ўручную або пры дапамозе фрэзеравання, што было дастаткова працаёмкім працэсам. Перавага 3D-друку — у прастаце, невысокім коште і, галоўнае, — у хуткасці. А калі дапушчана памылка, яе можна адразу ж выправіць.

З'яўленне новых тэхналогій, і ў першую чаргу 3D-прынтараў, дазволіла ажыццявіць сапраўдны пераварот у вырабе дэталяў для тых ці іншых механізмаў. Цяпер нават дзіця можа пры дапамозе спецыяльнай праграмы змадэляваць любую дэталь і накіраваць мадэль на прынтар, які надрукуе яе з пластыку.

3D-мадэляванне развівае ў падлеткаў прасторавае мысленне, яны атрымліваюць навыкі работы з чарцяжамі, паколькі самі павінны намаляваць эскіз. Мае выхаванцы, напрыклад, стварылі дэталі для веласіпеда. Быў сярод іх рэалізаваных ідэй і чахол для тэлефона.

**Ігар МАЦЮШКА, загадчык лабараторыі прафесійна-тэхнічнага мадэлявання:**

— У нашым аб'яднанні мы вучым будучых канструктараў рабоце з сістэмай аўтаматызаванага праектавання (САПР). Калі 20—30 гадоў таму канструктары выкарыстоўвалі звычайны аловак і паперу, то цяпер усё робіцца на камп'ютарах і працэс істотна паскараецца. Праграмы дазваляюць разлічваць усё імгненна (памеры, аб'ёмы, вагу, нагрузку), працаваць са схемамі, чарцяжамі, ствараць 3D-мадэлі. САПР — праграмы для праектавання і выпуску рабочай праектнай дакументацыі, якая паступае на вытворчасць для наступнага вырабу нейкіх дэталяў або элементаў... Плюс гэтыя праграмы дазваляюць аўтаматычна канвертаваць дадзеныя файлы ў спецыяльны файл, які выкарыстоўваецца на станках з лічбавым праграмным кіраваннем. Усё зробіць адзін станок, трэба толькі ўсталяваць патрэбны інструмент, даць тэхніцы заданне і націснуць на кнопку... Таксама праграмныя комплексы дазваляюць выкарыстоўваць візуалізацыю, і нават калі заказчык нічога не разумее ў чарцяжах, ён зможа ўбачыць усё на малюнку, створаным у праграмных комплексах. Дзякуючы візуалізацыі можна праглядаць мадэлі пад розным вуглом, паварочваць дэталі ў трох вымярэннях. А анімацыя дазваляе зрабіць віртуальную зборку са створаных элементаў. Спецыялісты, якія ўмеюць карыстацца такімі праграмамі, запатрабаваныя, таму што канструктары патрабуюцца паўсюдна: і на мэблевай вытворчасці, і ў машынабудаванні, будаўніцтве, архітэктуры і гэтак далей. А навучальныя ўстановы выпускаюць іх пакуль у недастатковай колькасці.

Таму наш напрамак — адзін з самых перспектыўных, а той, хто думае, што гэты занятак выключна для хлопцаў, сур'ёзна памыляецца. Летась у нас вельмі паспяхова займаліся і дзяўчаты (вучаніцы 9 і 10 класаў). Адна з іх выступала за наш цэнтр у фінале JuniorSkill Belarus у кампетэнцыі «інжынерны дызайн CAD».

### ❍ БУДЗЬ У КУРСЕ!

**8 верасня ў Рэспубліканскім цэнтры інавацыйнай і тэхнічнай творчасці (вуліца Славінскага, 12) пройдзе Дзень адкрытых дзвярэй. Запіс у аб'яднанні па інтарэсах будзе доўжыцца да 15 верасня.**

## ТРЭНІРОЎКІ ДЛЯ МОЗГА

**Жанна РАКАВА, педагог дадатковай адукацыі, напрамак — мабільная робататэхніка і нейратэхналогіі:**

— Робататэхніка — гэта не проста канструяванне робатаў, як некаторыя памылкова думаюць. Можна мець дома дарагі канструктар, нават сабраць робата, але што далей? А паспрабуй стварыць разумнага робата, запраграмуй яго на пэўныя дзеянні, распрацуй стратэгію яго паводзін... Робататэхніка дапамагае нашым выхаванцам спасцігаць законы фізікі і прынцыпы механікі, развівае творчае мысленне і логіку, вучыць складаць як простыя, так і складаныя алгарытмы. У малодшых дзяцей падчас работы з канструктарам развіваюцца дробная маторыка і прасторавае мысленне, выпрацоўваюцца ўседлівасць, уважлівасць, уменне рабіць нешта рукамі. Немалаважны фактар — уменне працаваць у камандзе. У апошні час назіраецца зніжэнне камунікатыўных навыкаў у падлеткаў, бо яны ў большай ступені кантактуюць у сацыяльных сетках. У нас дзеці вучацца працаваць побач з іншымі, быць «камандным гульцом», прыслухоўвацца да чужога меркавання, умець знаходзіць нестандартныя рашэнні і выйсце са складаных сітуацый, браць на сябе адказнасць. Не толькі за сябе, але і за ўвесь праект.

Таксама ў нашым аб'яднанні ёсць нейрагарнітура, якая дапамагае даследаваць і трэніраваць мазгавую актыўнасць. Яна адзяваецца на галаву, на вуху замацоўваецца прышчэпка, а на лбе — электрод. У мозгу чалавека адбываецца мноства фізіка-хімічных працэсаў. Іх падсумоўванне прыводзіць да з'яўлення электрычнай актыўнасці. Імпульс, што праходзіць праз электрод, паказвае наш стан: раздражненне, агрэсію, расслабленасць, канцэнтрацыю ўвагі. Нейрагарнітура па блютузе звязана з планшэтам або камп'ютарам. З дапамогай сілы думкі мы можам кіраваць віртуальнымі і фізічнымі аб'ектамі. Камп'ютарныя інтэрфейсы распазнаюць нашу разумовую актыўнасць, псіхаэмацыянальны стан і інтэрпрэтуюць іх у каманды. Напрыклад, можна падняць шарык сілай думкі. Для гэтага трэба дамагчыся высокіх паказчыкаў альфа-рытму, гэта значыць расслабіцца. У другой гульні, наадварот, патрабуецца максімальная канцэнтрацыя ўвагі, каб спаліць віртуальную бочку.

На спаборніцтвах JuniorSkill Belarus канкурсанты тэсціравалі праграму «Спрынт», якая ўключае бег, падыманне штангі (дарэчы, яе вагу можна было выбіраць — ад 50 да 100 кілаграмаў), стральбу з лука і гэтак далей. Перакanана, што нейратэхналогіі — гэта будучыня, адно можна сказаць з упэўненасцю ўжо цяпер: здольнасці мазгавой актыўнасці чалавека трэба вывучаць. Наш мозг можна і трэба трэніраваць. Мара аб пашырэнні магчымасцяў чалавечага мозга цалкам здзяйсняльная...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Не вучобай адзінай*

# Кіпела справа ў руках

**Каля 3,5 тысячы маладых людзей працавалі гэтым летам у складзе студэнцкіх атрадаў у сталіцы. Усяго ў Мінску было створана 285 будаўнічых, сэрвісных, сельскагаспадарчых і вытворчых студатрадаў.**




На Усебеларускай маладзёжнай будоўлі — Беларускай АЭС у Астраўцы — у складзе беларуска-расійскага атрада шчыравалі 80 прадстаўнікоў сталічных устаноў адукацыі. Сумесны беларуска-расійскі атрад працаваў і на будаўніцтве інтэрната ў Студэнцкай вёсцы. А мінскія студэнты адправіліся дапамагаць у рэканструкцыі Царскасельскага палаца, размешчанага ў горадзе Пушкін пад Санкт-Пецярбургам.

Не менш важны напрамак другаснай занятасці моладзі — індывідуальнае працаўладкаванне. 340 маладых людзей знайшлі часовае рабочае месца на такіх прадпрыемствах, як «Атлант», «Гарызонт», «Дрымлэнд». Яшчэ адзін напрамак работы, у тым ліку па арганізацыі другаснай занятасці моладзі, — фарміраванне валанцёрскіх атрадаў. У складзе 115 такіх атрадаў былі задзейнічаны 1732 чалавекі.

Асобна варта адзначыць удзел моладзі ў гарадской акцыі па добраўпарадкаванні месцаў пахаванняў «Мы памятаем», у рэспубліканскай акцыі «Аднаўленне святынь Беларусі», у праекце «Мой родны кут». Апошні накіраваны на навядзенне парадку і ўдасканаленне знешняга выгляду дваровых тэрыторый (праект будзе доўжыцца да 2020 года і ў перспектыве ахопіць двары ў кожным адміністрацыйным раёне сталіцы).

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Іншае вымярэнне*

# Проста згубіцца ў часе...

**...Мне здаецца, што ў кожнага чалавека хоць бы аднойчы было такое пачуццё, калі ты быццам губляешся ў часе. У мяне такое звычайна здараецца летам. Цэлыя 92 дні свабоды!**

З дзяцінства летнія канікулы я люблю праводзіць у вёсцы. Ведаеце, што раблю першай справай, калі прачнуся? Як толькі сонейка будзіць мяне сваімі праменьчыкамі, расплюшчваю вочы, пакідаю ложак і накіроўваюся да рыпучай лесвіцы, якая вядзе на двор. Там мяне, яшчэ сонную, з непаслухмянымі кудзеркамі, босую і ў піжаме, сустракае кацяня. Яно ведае, што гаспадыня прынясе штосьці смачненькае. Пакуль гарэза снедае, я атрымліваю асалоду ад наваколля: сонейка свеціць, ветрык вее, пеўні будзяць тых, хто яшчэ не прачнуўся. Што можа быць лепей? Толькі ў такія моманты я разумею, што свабодная. Ад школы, ад хатніх заданняў, ад прапускаў, якія трэба адзначаць у настаўніцкай кожную раніцу, ад кантрольных па геаметрыі, якую я ніколі не разумела...

У гэтым вучэбным годзе было цяжкавата — ён быў маім апошнім у школе. Бясконцыя рэпетытары, даклады, дадатковыя заданні... Пазней — рэпетыцыі выпускнога, вальса, школьныя экзамены. Асабліва цяжка было вясной. Сэрца і душа хацелі спяваць, думкі накont паступлення самі сабой адыходзілі на другі план. Замест іх з'яўляліся ідэі пабегу з урокаў, каб паесці ў парку Чалюскінцаў салодкую вату, пакатацца на каруселях, пасядзець на лаўцы — такім чынам стаць вольным, хоць і на дзве гадзіны. Я лічу, што жыць у такім шалёным рытме нельга! Трэба даваць сабе спыніцца, аддыхацца, атрымаць асалоду ад жыцця. А потым з новымі сіламі кідацца ў бой.

Пасля таго як адгрымеў выпускны і разам з аднакласнікамі мы сустрэлі наш апошні світанак, заставаўся апошні рывок — ЦТ. А мяне яшчэ чакала дадатковае выпрабаванне — унутраныя экзамены. Увесь гэты час я была ў дзікім напружанні. Нават калі даведалася, што стала студэнткай, яшчэ доўгі час не магла ўсвядоміць, што ўсё гэта на самай справе!..

Так, гэтыя канікулы былі не такімі, як ранейшыя. У маім распараджэнні заставаўся роўна тыдзень. І ён быў напоўнены спакоем, утульнасцю з кубкам цёплага чаю ўвечары. Не было месца слязам, перажываннямі і экзаменам! Я выходзіла пасядзець на лаўцы і палічыць ластавак. Як выдатна, калі не трэба кудысьці бегчы і змагацца з праблемамі. Можна проста сядзець і ўсміхацца. Проста згубіцца ў часе...

**Кацярына ЯРАШЭВІЧ, студэнтка I курса факультэта журналістыкі БДУ.**

*Карысны досвед*

# Працоўныя канікулы? Місія выканальная!

*— Ой, а што гэта тут праляцела ?!*

*— Гэта лета, яно часта тут пралятае...*

*(Жарт з сеціва.)*

**Што і казаць, яно ў нашых шыротах сапраўды кароткае. Асабліва — у абітурыентаў і студэнтаў... Тым не менш многія маладыя людзі скіравалі сваю энергію падчас канікул не толькі на адпачынак, але і ў іншае рэчышча — працавалі летам. Я распытала сваіх сяброў пра гэты іх сёлетні досвед.**



**Аляксандра МЯЦЕЛЬСКАЯ, студэнтка II курса прыборабудаўнічага факультэта БНТУ:**

— Гэтым летам у Смалявічах, дзе жыву, якраз адкрываўся маладзёжны цэнтр, куды патрабаваўся персанал. Знаёмы прапанаваў вакансію афіцыянта, і я пайшла. Графік быў зменны. Часцей за ўсё шчыравала ў ноч на выхадныя, таму і адпачываць паспявала. Ды і на рабочым месцы было весела: калектыў цэнтра — малады, складаўся з творчых і цікавых людзей. Больш за тое, палова супрацоўнікаў — мае добрыя сябры ці знаёмыя, бо горад маленькі. Атмасфера была вельмі прыязнай і ўтульнай.

Праца афіцыянта прадугледжвае цеснае ўзаемадзеянне з кліентамі. А яны — розныя. Хтосьці разумеў, што цэнтр адкрыўся зусім нядаўна і яшчэ не ўсё ідэальна адладжана. А нехта патрабаваў усяго і адразу. Маёй задачай у такім выпадку было без лішніх канфліктаў выканаць просьбы кліентаў, калі гэта было магчыма.

Дзякуючы гэтай працы я змагла аплаціць частку свайго адпачынку на моры.

**Анастасія КУЛЕЎСКАЯ, студэнтка V курса факультэта замежных моў БрДУ імя А. С. Пушкіна:**

— Я шукала месца не толькі на лета, але і, у перспектыве, на будучыню. З такой умовай студэнту, на жаль, не проста ўладкавацца. Галоўная прычына, па якой адмаўляюць усе работадаўцы — адсутнасць вопыту. А таксама тая акалічнасць, што часцей за ўсё студэнтам неабходны гнуткі індывідуальны графік. Але я знайшла працу сакратара ў адной з прыватных кампаній Брэста, дзе ўсё супала: офіс каля ўніверсітэта, зручны графік, добры калектыў і, вядома, дастойная заработная плата. Гэта вялікая ўдача!

Магчымасць зарабляць і самастойна забяспечваць сябе для мяне ў прыярытэце, а адпачынак ужо на другім месцы.



**Марыя ШАНОВІЧ, навучэнка IV курса аддзялення англійскай мовы Лінгвагуманітарнага каледжа (Мінск):**

— Па накіраванні ад каледжа трапіла на практыку на месца важатай у летнік. Была ў ім адну змену, 21 дзень. Праца прыносіла задавальненне, склаліся цёплыя адносіны з калегамі, я выдатна ладзіла з іншымі важатымі. Мне, пачаткоўцу, яны часта дапамагалі парадай. А вось знайсці агульную мову з дзецьмі часам бывала складана. Асабліва калі тыя ўвогуле цяжка ўжываюцца ў калектыве. Але хапала і станоўчых момантаў, бо мне па душы арганізацыя дзіцячага (і не толькі) адпачынку, раскрыццё творчых здольнасцяў. Мы з хлопцамі і дзяўчатамі шмат спявалі, танцавалі, смяяліся. Нягледзячы на цяжкасці, я адчувала аддачу. А на заробленыя грошы змагла ненадоўга з'ездзіць да мора.

**Дар'я ЮХНІК, студэнтка III курса лячэбнага факультэта БДМУ:**

— Ужо не першы год на канікулах я падпрацоўваю ў сферы сваёй будучай дзейнасці. У гэтым годзе працавала ў рэгістратуры Смалявіцкай раённай паліклінікі.

Калегі да мяне ставіліся добра. Спачатку было цяжка арыентавацца сярод стэлажоў з вялікай колькасцю картак пацыентаў, але ўжо пасля першага тыдня я стала амаль на роўных працаваць з пастаяннымі работнікамі.

У працы рэгістратара ёсць свае цяжкасці. Напрыклад, пацыенты часта патрабавалі адказы на пытанні, якія не ўваходзяць у маю кампетэнцыю. З іншага боку, імкнучыся дапамагчы кожнаму, я не раз чула шчырыя словы падзякі і бачыла непадробленае здзіўленне майму імкненню якасна выконваць сваю працу.

Прызнаюся: стамлялася нават менш, чым падчас вучобы! Бо пасля працы не даводзілася нешта вучыць і рыхтавацца да заўтрашняга дня. І ў мяне заўсёды знаходзіўся час для прагулак і сустрэч з сябрамі.

**Мікіта ЛАПКОЎСКІ, студэнт III курса факультэта інжынерных сістэм і экалогіі БрДТУ:**

— Ва ўніверсітэце я атрымліваю спецыяльнасць інжынера-меліяратара. Канешне, мне хацелася знайсці на лета працу менавіта па ёй. Але ж, зразумела, што ніхто не возьме на гэтую пасаду студэнта з няпоўнай адукацыяй. Таму я працаваў хоць і ў профільнай арганізацыі Брэста, але ж падсобным рабочым: пафарбаваць што-небудзь, перанесці, пакасіць траву... Для хлопца праца не цяжкая, складанасцяў не ўзнікала. А калі што-небудзь было незразумела, я заўсёды мог звярнуцца з пытаннямі да кіраўніцтва. Зазначу, што адносіліся да мяне добра. Увогуле, да студэнтаў ставяцца так, як тыя сябе пакажуць, па якасці іх працы. Намагаюцца нават «выпрабаваць» маладога чалавека, каб выявіць самыя лепшыя якасці і надалей даваць яму работу, з якой ён будзе спраўляцца найлепш.

Так у самы першы дзень «пратэсціравалі» і мяне, а я нават гэтага і не зразумеў спачатку. Прапанавалі напісаць сваё прозвішча, а почырк у мяне добры. Таму і далі запаўняць журналы і дарожныя лісты. Таксама рабіў на камп'ютары некаторыя дакументы.

Нават і не думаў спачатку, што так буду сумаваць па адпачынку: працаваць даводзілася з васьмі раніцы (а калі-нікалі і з сямі) і да сямнаццаці. І нават пасядзець-адпачыць не было калі. Але ж зарплата, вялікая для студэнта, мяне вельмі ўзрадавала.

**...Што ж датычыцца асабіста мяне, то гэтае лета было вельмі насычаным і даволі цяжкім. Папрацаваць я нідзе не паспела, паколькі была не толькі выпускніцай каледжа, але і абітурыенткай. А ў выніку я магу радавацца таму, што стала студэнткай! Месяц, што застаўся пасля шматлікіх экзаменаў, я з задавальненнем і, што немалаважна, з чыстым сумленнем выкарыстала на адпачынак.**

**Віншую ўсіх студэнтаў першых курсаў з пачаткам новага найцікавейшага перыяду ў іх жыцці. І жадаю ім, і не толькі, цікавага і плённага навучальнага года.**

**Паліна ПРАКАПЕНЯ, студэнтка I курса факультэта журналістыкі БДУ.**

ЧЫРВОНКА. Чырвоная змена
6 09 2018 г.

СУМЕСНЫ ПРАЕКТ
Скарбонка добрых спраў. БРСМ. Чырвонка

# Святу — новы працоўны пачын

**6 верасня БРСМ спаўняецца 16 гадоў. Актывісты Саюза моладзі адзначаць дзень нараджэння арганізацыі не словамі, а справамі.**

У сталіцы сёння на Камсамольскім возеры з'явіцца першая адкрытая крэатыўная прастора «Беларусь — крыніца натхнення». Добраахвотнай працоўнай акцыяй Саюз моладзі на чале з лідарам арганізацыі Дзмітрыем Варанюком дасць старт новаму агульнарэспубліканскаму праекту «#ЗаДело!». Яго назва выбрана невыпадкова, паколькі ў ёй закладзены дваякі сэнс. Гэта ўласна і заклік заняцца канкрэтнымі справамі, і своеасаблівае пытанне накont таго, што чапляе маладых людзей, на што б яны хацелі звярнуць увагу і што змяніць. «Зачапіла тое, што адбываецца вакол цябе? Навядзі парадак на малой радзіме: пачні з сябе, свайго двара, вуліцы, класа, рабочага месца». Падчас рэалізацыі працоўнага праекта плануецца добраўпарадкаваць валейбольную, футбольную і дзіцячую пляцоўкі.

Дзень нараджэння — выдатная нагода сустрэцца за салодкім сталом разам з выхаванцамі аднаго са сталічных дзіцячых дамоў і ўручыць ім да новага навучальнага года падарункі ад Мінскай гарадской арганізацыі БРСМ у рамках дабрачыннай акцыі «У Саюз з сябрамі».

Па калена ў гразі, але азартна, крута і весела... Так незвычайна прапануе адзначыць свята навучэнскай і працоўнай моладзі Зэльвенская раённая арганізацыя БРСМ. Трэба будзе прадэманстраваць фізічную форму і праявіць вынослівасць у турніры па балотным валейболе на беразе ракі Зэльвянкі. Гэта набіраючы папулярнасць від спорту і актыўнага адпачынку.

А валанцёры БРСМ з «Добрага Сэрца» з усёй Гомельшчыны падчас абласнога этапу рэспубліканскай дабрачыннай акцыі «Аднаўленне святынь Беларусі» ўжо зрабілі свой працоўны ўнёсак да свята — літаральна напярэдадні дапамаглі з добраўпарадкаваннем тэрыторыі храма Святога благавернага князя Аляксандра Неўскага ў Гомелі.

Аб'ектам жа клопату валанцёраў Магілёўшчыны ў рамках абласнога маладзёжнага праекта «Добрыя справы табе, мая малая радзіма!» стала крыніца ў вёсцы Галынец. Актывісты БРСМ напярэдадні дня нараджэння свяёй арганізацыі добраўпарадкавалі месца для зручнага забору вады і ўладкавалі зону адпачынку.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Мова прыцягнення*

# КЛЮЧЫК ДА НЕВЯДОМАЙ КУЛЬТУРЫ

## Чым каханне адрозніваецца ад любові


Не бачыў галоўны «брыльянт» краіны — лічы, не быў у Мінску.

**Сёлета ў БДУ прайшла ўжо чацвёртая Міжнародная летняя школа беларусістыкі. Замежнікі з дзевяці краін на два тыдні прыехалі ў Мінск, каб вывучыць нашу мову. Які багаж ведаў і ўражанняў павезлі яны да сябе на радзіму, даведалася «Чырвонка. Чырвоная змена».**

**Яна КАЛІЯШАВА** жыве ў Чэхіі. Студэнтка філасофскага факультэта Пражскага ўніверсітэта даследуе рускую філалогію і тэорыю літаратуры.

Дзяўчына валодае французскай, англійскай, рускай і крыху польскай мовамі. Нашу лексіку ёй нескладана зразумець, бо яна падобная да апошняй і роднай. А вось мяккія гукі [з'] і [дз'] ёй даюцца цяжка. Справіцца з фразай «Смела з'еў дзвесце змей» — сапраўдная перамога.

— Кожны раз у школе адкрываю для сябе штосьці новае ў галіне мовы — фразеалагізмы, прымаўкі. Нават скорагаворкі спрабавала вымаўляць, — дзеліцца дзяўчына.

У Беларусі яна ўжо трэці раз і паспела паглядзець Навагрудак, Іўе. Жартуе, што ў Мінску абышла амаль усе бібліятэкі і музеі. Яне вельмі падабаецца сталінская манументальная архітэктура сталіцы і шырокія вуліцы.

Да сябе на радзіму дзяўчына павезла не толькі ўражанні, але і нашы прадукты. Прызнаецца, што вельмі любіць квас. У Чэхіі яго амаль немагчыма купіць, а калі і знойдзеш, то маленькая бутэлька будзе каштаваць два еўра. Набыла таксама кераміку — сваім знаёмым у падарунак узяла гліняныя свістулькі ў выглядзе птушак.

**Давід КУРКОЎСКІ** прыляцеў з ЗША. Ён выпускнік Ельскага ўніверсітэта, займаўся там славістыкай і інфарматыкай.

— У мяне практычныя бацькі і бабулі: яны вельмі хацелі, каб я быў праграмістам у Штатах. Але гэтага не здарылася, — жартуе хлопец.

Славістыкай ён захапіўся, бо праз яе можна паглыбіцца ў гісторыю і літаратуру. Пачаў удасканальваць рускую мову, а потым зацікавіўся ўкраінскай і беларускай. Калі вучыўся ў бакалаўрыяце, нават пісаў навуковы тэкст пра адрозненні дзвюх апошніх. Зараз чытае пераклады па-беларуску. З восені хлопец адпраўляецца на стажыроўку ў Варшаўскі ўніверсітэт, дзе ў тым ліку будзе працягваць вывучаць і нашу мову.

Заўважае, што не ўсе літаратурныя нормы яму зразумелыя: «Напрыклад, нас вучылі, што правільна вымаўляць «прабацьце» замест «прабачце», але ў вас так ніхто не кажа».

Калі прапаную Давіду перайсці на рускую мову, каб яму было лягчэй, хлопец адмахваецца: «Не-не». У Мінску ён стараецца размаўляць па-беларуску і за межамі ўніверсітэцкіх аўдыторый. Праўда, гэты вопыт не заўсёды станоўчы.

— Вось я неяк зайшоў у кавярню каля вакзала, папрасіў сурвэтку. На мяне так прадавачка паглядзела. «Што?» — некалькі разоў перапытала, быццам я абразіў яе. Пакуль на рускай мове не сказаў, не зразумела.


У вывучэнні мовы галоўнае — практыка.

У Мінску хлопец бывае часта. Кажа, яму падабаецца, што наша моладзь вельмі актыўная — цікавіцца рознымі трэнінгамі і праектамі ў нефармальнай адукацыі.

Калі пытаюся ў кітаянкі **Чжаа ДАНЬ**, як ёй вывучэнне беларускай мовы, дзяўчына не хавае: складана...

— Часта блытаю словы з рускімі, — тлумачыць магістрантка Другога пекінскага ўніверсітэта замежных моў. — Вось у вас рамантычныя адносіны паміж мужчынам і жанчынай называюцца «каханне». А ў рускай мове слова «любоў» для ўсіх выпадкаў падыходзіць.

Дзяўчына дзеліцца, што для яе візіт у Беларусь — гэта яшчэ і першая паездка ў Еўропу. Незабыўнае ўражанне!

— На памяць купіла фігурку бусла. Прадавец сказаў, што гэта сімвал удачы, шчасця і дабрабыту.

Што цікава, у школу беларусістыкі прыязджала не толькі моладзь, чыя спецыяльнасць звязана з філалогіяй. Напрыклад, паляк **Міхал ХАЛЕВІЧ** працуе... праграмістам.

— Лінгвістыка — маё хобі, — здзіўляе хлопец. — Я люблю ўсходнеславянскія мовы і вырашыў вывучыць беларускую. На занятках тут усё разумею, але праблема ў тым, што не ведаю, як самому гаварыць.

Пасля знаёмства з краінай айцішніку запаў у душу Нясвіжскі замак. А яшчэ наша кухня.

— Я еў дранікі, шмат дранікаў. Вельмі смачна! Таксама мачанку каштаваў — мне спадабалася.

Бадай, найбольш складана на занятках прыйшлося італьянцу **Эдуарда НЭГРА**. Беларускую мову за гэтыя два тыдні ён вучыў з нуля. Пытаюся, якія словы цяпер ёсць у яго арсенале.

— «Дзякуй вялікі», «калі ласка», «вельмі прыемна», «слухайце», «паўтарайце», — з усмешкай пералічае Эдуарда і дадае, што для італьянца мова цяжкая: вымаўленне істотна адрозніваецца.

Ён жыве каля Турына і працуе выкладчыкам у сярэдняй школе. Выкладае тэхнічныя дысцыпліны. «Маё поле дзейнасці зусім іншае. Але мовы — гэта так цікава», — тлумачыць настаўнік, чаму ў вольны час ён вырашыў паглыбіцца ў лінгвістыку, а не ў інжынерыю.

Італьянец адзначае, што ў нас усё таннейшае — ежа, транспарт. Напрыклад, у Турыне білет у метро каштуе 1,9 еўра.

— Першае ўражанне ад Мінска — вялікі чысты горад, дзе шмат кветак. І людзі вельмі ветлівыя, — дзеліцца Эдуарда. Ад'язджаючы на радзіму, у свой чамадан ён спакаваў гліняныя і драўляныя сувеніры, а таксама беларускі шакалад і печыва.

Усяго ў летняй школе навучалася 14 чалавек. «Сёлета мы бралі не колькасцю, а якасцю: у многіх, хто прыехаў, не пачатковы ўзровень валодання мовай, — адзначае **загадчыца кафедры маладзёжнай палітыкі і сацыякультурных камунікацый Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы Алена ІГНАТОВІЧ**. — Напрыклад, была дзяўчына з Германіі, якая цудоўна размаўляе па-беларуску і збіраецца спрабаваць перакладаць нашых сучасных аўтараў на нямецкую мову».

У першай палове дня ўдзельнікі школы займаліся адукацыяй: хадзілі на практыку маўлення, лекцыі з цікавымі асобамі, напрыклад паэтам Андрэем Хадановічам. Тым, хто зусім не ведаў беларускай, дапамагалі валанцёры, якія сядзелі побач. А ў адной групе ў пары з педагогам «працавала» лялька Стася, якая, жартуюць, магла размаўляць любога. «Але справа, вядома, не ў чараўніцтве, а ў прафесіяналізме выкладчыкаў», — дадае Алена Ігнатовіч.


Знаёмства з беларускай культурай у музеі гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук.

У другой палове дня замежнікаў чакала культурная праграма. Не толькі класічныя экскурсіі (у Нацыянальны мастацкі і гістарычны музеі, Заслаўе, Нясвіж), але і знаёмства з маладзёжнымі месцамі сталіцы: тусовачнай вуліцай Зыбіцкай, хіпстарскай Кастрычніцкай, пляцоўкай з вулічнай ежай «Пясочніца».

Школа беларусістыкі — праект валанцёрскі. Удзельнікам выдзяляюць месца ў студэнцкім інтэрнаце, бясплатна праводзяць культурную і адукацыйную праграмы. Арганізатары дапамагаюць ім бясплатна адкрыць візу, але за праезд і харчаванне яны плацяць самастойна.

У гэтым годзе ўпершыню арганізавалі таксама беларускамоўную школу для дзяцей, якая працавала два тыдні. Заняткі там праходзілі ў гульнявой форме, і далучыцца да іх запрашалі не толькі замежных гасцей, але і маленькіх беларусаў.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

# На хвалі эфіру...




## Да 10 раніцы — ніякага крымiналу

— Мы займаем палову паверха — рэдкая раскоша для радыйшчыкаў Мінска. Звычайна яны туляцца ў некалькіх пакойчыках, — арганізуе для нас «экскурсію» **намеснік дырэктара па інфармацыйна-аналітычным вяшчанні Дзмітрый АНІСАВЕЦ.**

Вядучыя навін працуюць у дзве змены: з 6.00 да 14.00 і з 14.00 да 21.00. Тыя, хто знаёміць з галоўнымі падзеямі краіны і свету, выходзяць у эфір на пачатку кожнай гадзіны, тыя, хто расказвае пра рэгіёны, — у сярэдзіне.

— Я каву не п'ю, каб узбадзёрыцца. Проста калі з самай раніцы працуеш у студыі, адразу прачынаешся. А ўжо пасля змены пачынаеш «заліпаць», — дзеліцца **вядучы Антон КАВАЛЬЧУК.**

Калі думаеце, што радыйшчыкам трэба толькі прачытаць ужо падрыхтаваную інфармацыю, то памыляецеся. Кожны выпуск яны пішуць самі. Асноўны блок навін доўжыцца да трох хвілін і ўключае пяць паведамленняў. З іх адно абавязкова павінна быць пра Мінскую вобласць, другое — пра эканоміку. Усё астатняе — як вырашыць вядучы. Фарміраваць выпуск можна па класічнай схеме (калі спачатку ідзе палітыка і эканоміка, а потым «сацыялка», культура і спорт) або ў выглядзе перавернутай піраміды (тыя ж тэмы ў адваротным парадку).

— Ты павінен падаваць інфармацыю так, быццам расказваеш яе блізкаму. Калі спачатку цяжка, можна раздрукаваць фатаграфію сябра ці роднага і павесіць перад сабой, — дзеліцца некаторымі сакрэтамі **вядучая Кацярына ЛАПІЦКАЯ.** — Навіну трэба пісаць зразумела. Я стараюся, каб яна змяшчала не больш за пяць сказаў і максімум тры лічбы. Можна рабіць лагічныя пераходы, тады з паведамленняў атрымаецца адно цэлае.

— Стараемся працаваць у фармаце агенцтва навін. Усё свежае, што паступае, — адразу ў эфір, — каза Дзмітрый Анісавец. — Выпускі ці асобныя навіны не павінны паўтарацца. Калі нейкая інфармацыя з'явілася больш за тры гадзіны таму, для радыё яна, лічы, састарэла.

***— А што, калі навін няма?***

— Значыць, журналіст дрэнна папрацаваў. Крыніц інфармацыі шмат: нашы агенцтвы, сайты замежных СМІ — BBC, Daily Mail... Трэба толькі не ленавацца шукаць.

На радыё ёсць няпісанае правіла: да 10 раніцы — ніякіх паведамленняў пра аварыі і крымінал. А падрабязнасцям жорсткіх забойстваў увогуле не месца ў эфіры. «Бо радыё — не газета. Уявіце: хтосьці раптам пачуў такую навіну і ў яго падскочыў ціск, — тлумачыць **дырэктар Тамара ВЯЦКАЯ.** — Наша задача — пастаўляць інфармацыю і пры гэтым не выклікаць стрэсу, трымаць добры настрой. Мы нават слоган адпаведны прыдумалі: «Нас не штарміць».

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

## Агаворкі і іншыя непрыемнасці

— Дзяўчаты, а давайце ў прамы эфір, адчуеце адрэналін, — нечакана прапануе Тамара Вяцкая. — Што, слабо? Ведаеце, як гэта страшна? Кожны раз страшна, хоць я 35 гадоў у прафесіі. Але крута.

Прамы эфір — рэч непрадказальная. Толькі ў студыі загараецца лямпачка — нават вопытныя госці губляюцца. Дый у саміх вядучых здараюцца праблемы з націскамі і агаворкі. На радыё жартуюць: міма пільных слухачоў нічога не пройдзе. Яны потым звоняць і пішуць, каб паказаць на памылкі.

— Калі запнуўся, галоўнае не хвалявацца і працягваць чытаць. Інакш саб'ешся зноў, — раіць Кацярына Лапіцкая. — Агаварыўся — робіш паўзу і потым кажаш, як правільна. Ні ў якім разе не прасіце прабачэння, інакш прыцягнеце ўвагу да сваёй памылкі. Нельга выходзіць у эфір, калі асіп, кашляеш ці пачалася ікаўка. Што рабіць? Мяняцца з некім. Бываюць выпадкі, калі падчас выпуску навін распірае смех. У такім разе лепш адразу заканчваць і развітвацца.

Адна з галоўных загадак для слухачоў — што адбываецца ў студыі падчас праграмы? Вядучыя прызнаюцца, што, калі мікрафон выключаны, часта жартуюць між сабой. А вось перакусы ў музычную паўзу не вітаюцца: гэта парушэнне дыцыпліны. А яшчэ ніхто не сядзіць у шортах і сланцах — радыйшчыкі адзяваюцца на работу так, як і ўсе офісныя работнікі.

У прамы эфір выйсці я не рызыкнула: вырашыла паберагчы ад стрэсу і сябе, і слухачоў. А вось прачытаць навіны пад запіс — чаму б не?

Бяру раздрукоўкі і сядаю да мікрафона. «Прыйшоў загадзя — разамні артыкуляцыйны апарат», — заклікае таблічка на стале. У мяне часу не так шмат, таму прабягаю вачыма па словах і пачынаю.

Вось шчыра: чытаць навіны ўголас — вельмі хвалююча. Некалькі памылак зрабіла на роўным месцы. Напрыклад, сваёй агаворкай павялічыла кошт беларускіх угнаенняў для Кітая на дзевяць долараў за тону. А паведамленне пра п'яных кіроўцаў, як мне падалося, прагучала занадта весела.

Чакаю некалькі хвілін, пакуль гукарэжысёр апрацоўвае запіс, і прашу Дзмітрыя Анісаўца ацаніць: ці атрымалася?

— З дыкцыяй нядрэнна, і тэмп добры, якраз для вядучага навін, — пракаментаваў ён. — Агрэхі ёсць, але над гэтым можна працаваць.

Праўда, з адным мінусам справіцца будзе няпроста — мой голас, які гучыць, як у школьніцы.


У прамым эфіры — намеснік дырэктара па інфармацыйна-аналітычным вяшчанні Дзмітрый Анісавец.


Вядучая Кацярына Лапіцкая манціруе выпуск аўтарскай праграмы.

## Забудзьце пра семкі і арэхі

— Голас — наша ўсё. Калі журналіст суперталенавіты, але не мае голасу, ён нам не падыдзе. Я ў размове, нават па тэлефоне, ментальна магу вызначыць, наш чалавек ці не, — заўважае намеснік дырэктара.

Радыё любіць нізкія галасы — і жаночыя, і мужчынскія. Першыя складана знайсці, другія — прыцягнуць. Але голас можна «пасадзіць». «Пачак цыгарэт у дзень прывядзе да жаданага выніку», — жартуюць тут. А калі сур'ёзна, то для гэтага трэба працаваць з выкладчыкам. І ёсць выпадкі, калі тыя, каму спачатку адмовілі, пазаймаліся і нарэшце трапілі на работу.

Што цікава, не кожны тэлевізійнік зможа працаваць на радыё. Усё ж такі ў кадры іграюць ролю іншыя фактары і не самы моцны голас можа выратаваць «карцінка».

**Радыё любіць нізкія галасы — і жаночыя, і мужчынскія.**

Каб «добра гучаць», нельга ўжываць семкі, арэхі, печыва, піць каву. А вось сырыя яйкі з раніцы, смяюцца, тут ніхто не п'е.

***— Як трэніруюць дыкцыю?***

— Раней вымаўляў скорагаворкі, — дзеліцца Антон Кавальчук. — Памятаю, калі на СТБ працаваў, адзін вядучы часта практыкаваўся размаўляць, трымаючы ў роце ручку.

Яшчэ адзін нюанс: дыкцыя «заточваецца» пад тую мову, на якой размаўляеш штодзень.

Самі радыйшчыкі крытычна ставяцца да таго, як гучаць у эфіры.

— Задаволены сваім голасам? — пытаемся ў Дзмітрыя Анісаўца.

— Не, вядома, — усміхаецца ён. — Амаль ніколі не падабаецца.

## Калі без драйву сумна

Заўважалі, што ва ўсіх вядучых сугучныя імя і прозвішча? Гэта не заўсёды сапраўдныя пашпартныя даныя — некаторыя для работы бяруць псеўданімы.

Прафесійных прыкмет у радыйшчыкаў амаль што няма.

— Калі ўжо дзень не задаўся, то гэта не таму, што паперкі з тэкстам упалі, а я на іх не прысела, як гэта прынята ў акцёраў тэатра, — усміхаецца Кацярына Лапіцкая. — Хоць некаторыя адзяваюць у эфір штосьці чырвонае, каб не сурочылі.

Акрамя навін і музыкі, на радыё гучаць аўтарскія праграмы. Напрыклад, Кацярына вядзе перадачу «Не проста людзі» — пра тых, хто працуе ў сельскай мясцовасці, займаецца рамяством.

— Для мяне самыя лепшыя плёнкі — са звычайнымі людзьмі з глыбінкі, якія шмат робяць для іншых. Неяк запісвала гісторыю ўрача са Слуцкага раёна, якому споўнілася 90, а ён дагэтуль працуе на вясковым ФАПе, — успамінае дзяўчына.

«Плёнкамі» на радыё называюць аўдыязапісы. Хоць, вядома, яны захоўваюцца не на магнітных стужках касет, а ў выглядзе лічбавых файлаў на камп'ютары.

Праграмы вядучыя манціруюць самі. А ўжо прыгожае аздабленне робіць гукарэжысёр: апрацоўвае пераходы, накладвае музыку на фон.

— На радыё журналіст не бярэ ўсе лаўры сабе, там гучаць непасрэдна героі — і гэта крута, — лічыць Кацярына, якая ўлюбілася ў прафесію яшчэ пасля першай навучальнай практыкі.

Работа ў эфіры накладае адбітак. «Я вельмі балбатлівы, — не хавае Аляксандр Барскі. — Гэта звычка ўзнікае з-за боязі недарэчных паўз. Я магу запоўніць іх чым хочаш — задаць пытанне, напрыклад».

Некаторыя адзначаюць, што сталі па-іншаму размаўляць. Нават у звычайным жыцці старанна прадумваюць сказ, перш чым агучыць, стараюцца пазбегнуць паўтораў і актыўна жэстыкулююць.

— Мінусы прафесіі не назаву. А плюс у тым, што ты як вольны мастак — ствараеш, — падмячае Антон Кавальчук.

Да працы ў шалёным тэмпе і драйву ў прамым эфіры, кажуць, прывыкаеш. Настолькі, што ў водпуску без усяго гэтага сумуеш і хочаш хутчэй зноў апынуцца каля мікрафона.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

*Увага, конкурс!*

# Каму «Свежы вецер» прынясе «Хрустальнага зубра»?

**Нацыянальны дзіцячы адукацыйна-аздараўленчы цэнтр «Зубраня» праводзіць XIV фестываль-конкурс дзіцячых сродкаў масавай інфармацыі «Свежы вецер».**

Да ўдзелу ў ім запрашаюць вучняў 7—9 класаў, якія займаюцца журналістыкай, удзельнічаюць у падрыхтоўцы і выпуску радыё- і відэапраграм, інтэрнэт-блогаў, дзіцячых газет і часопісаў. Тым, хто хоча паспрабаваць свае сілы ў творчым спаборніцтве, неабходна да 15 верасня накіраваць у аргкамітэт заяўку і конкурсныя матэрыялы, паведамілі ў галоўным упраўленні па адукацыі Мінаблвыканкама.

Ахвотныя павінны прадставіць тры апошнія выпускі выдання, блогеры — суправаджальнае эсэ з апісаннем мэты вядзення блога і інтэрнэт-спасылку на рэсурс, радыё- або тэлепраграму, працягласць якой павінна складаць не больш за 7-8 хвілін. У ліку патрабаванняў да матэрыялаў — змястоўнасць і інфармацыйная насычанасць, адпаведнасць структуры і фармату, арыгінальнасць афармлення і тэхнічнага выканання, сацыяльная значнасць, грамадская і тэматычная накіраванасць.

Для ўдзелу ў фінале, які адбудзецца ў кастрычніку — лістападзе, будуць адабраны найлепшыя работы. Пераможцы фестывалю-конкурсу атрымаюць галоўны прыз — «Хрустальнага зубра». Вынікі будуць апублікаваны ў сродках масавай інфармацыі і на афіцыйным сайце «Зубраняці». Мэта мерапрыемства — стварэнне ўмоў для эфектыўнага фарміравання інфармацыйнай культуры, патрэбы да самарэалізацыі вучняў у галіне дзіцячай журналістыкі. Арганізатарам конкурсу выступае Міністэрства адукацыі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ БАНК
BELARUSKY NARODNY BANK

# ОАО «БНБ-Банк»

220012, Республика Беларусь, г. Минск, проспект Независимости, 87а

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2018 г.

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт приме-чаний | 2018 | 2017 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | АКТИВЫ | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 9 234 | 10 921 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 41 161 | 38 194 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 29 675 | 38 570 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 32 043 | 56 738 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 315 550 | 298 542 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 3 093 | 204 |
| 9 | Инвестиции в зависимые юридические лица | | | - | - |
| 10 | Инвестиции в совместно контролируемые юридические лица | | | - | - |
| 11 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 57 | - |
| 12 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 18 407 | 27 477 |
| 13 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | | 5 767 | - |
| 14 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | | 7 929 | 3 349 |
| 15 | Отложенные налоговые активы | 1112 | | - | - |
| 16 | Деловая репутация | | | - | - |
| 17 | Прочие активы | 1113 | | 6 449 | 7 451 |
| 18 | ИТОГО активы | 11 | | 469 365 | 481 446 |
| 19 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | | |
| 20 | Средства Национального банка | 1201 | | - | - |
| 21 | Средства банков | 1202 | | 60 379 | 67 964 |
| 22 | Средства клиентов | 1203 | | 313 642 | 325 162 |
| 23 | Ценные бумаги банка | 1204 | | 26 329 | 21 793 |
| 24 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | - | 83 |
| 25 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 26 | Прочие обязательства | 1207 | | 2 348 | 2 167 |
| 27 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 402 698 | 417 169 |
| 28 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | | |
| 29 | Уставный фонд | 1211 | | 27 688 | 11 075 |
| 30 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 31 | Резервный фонд | 1213 | | 6 400 | 6 400 |
| 32 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | | 11 000 | 11 244 |
| 33 | Накопленая прибыль | 1215 | | 21 579 | 35 558 |
| 34 | Всего собственный капитал, принадлежащий головной организации – банку | | | 66 667 | 64 277 |
| 35 | Доля неконтролирующих акционеров | | | - | - |
| 36 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 66 667 | 64 277 |
| 37 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | | 469 365 | 481 446 |

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за 2 квартал 2018 года

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт приме-чаний | 2018 год | 2017 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 16 424 | 19 599 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 7 185 | 9 417 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 9 239 | 10 182 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 5 531 | 4 460 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 2 213 | 1 261 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 3 318 | 3 199 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | (55) | (55) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 2 815 | 4 707 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | 2 974 | (638) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 1 931 | 2 319 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 4 175 | 736 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 15 802 | 9 409 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 909 | 587 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 3 824 | 5 816 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 1 434 | 749 |
| 17 | Прибыль (убыток) | 2 | | 2 390 | 5 067 |
| 18 | Доля в прибыли (убытке) зависимых юридических лиц | | | - | - |
| 19 | Доля в прибыли (убытке) совместно контролируемых юридических лиц | | | - | - |
| 20 | Итого прибыль (убыток) | | | 2 390 | 5 067 |
| 21 | Доля в прибыли (убытке), принадлежащая головной организации | | | 2 390 | 5 067 |
| 22 | Доля неконтролирующих акционеров в прибыли (убытке) | | | - | - |
| 23 | Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях | | | | |
| 24 | Базовая прибыль на простую акцию | | | - | - |
| 25 | Разводненная прибыль на простую акцию | | | - | - |

Заместитель Генерального директора С.К. Сабук

Главный бухгалтер Н.П. Шнип

Дата подписания: 30 августа 2018 года

Данная отчетность размещена на странице интернет-сайта БНБ-Банка:
**https://www.bnb.by/o-nas/nashi-rezultaty/bukhgalterskaya-otchetnost/**

**Открытое акционерное общество «Белорусский народный банк»**
Лицензия на осуществление банковской деятельности,
выданная Национальным банком Республики Беларусь, № 10 от 7 июня 2013 г.
УНП 100513485.

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении повторного аукциона

Крупское районное потребительское общество (продавец), проводит повторный открытый аукцион по продаже следующего объекта недвижимого имущества:

**Здание магазина ТПС № 39**, общей площадью **256,4 кв. м**, инв. № 613/С-59, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 623050100001000060 (предоставлен на праве постоянного пользования) площадью **0,1867 га**, по адресу: **Минская область, г. Крупки, ул. Ленина, 111**.

На земельном участке имеются ограничения: водоохранная зона р. Курнеевка (0,1867 га).

Начальная цена с НДС (20 %) – **92 064** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **9206,40** бел. руб.).

**Задаток перечисляется на р/с №BY48BAPB30153214700100000000** БИК BAPBBY2X в ЦБУ № 525 г. Крупки региональная дирекция по Минской области.

ОАО «Белагропромбанк», ул. Советская, 10, УНН 600093961, ОКПО 01796656.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 10 (десяти) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Аукцион состоится 21.09.2018 в 12.00 по адресу: Минская область, г. Крупки, ул. Ленина, 7. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **20.09.2018** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (801796) 54-936, 555-67.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| № лота | Предмет электронных торгов и его месторасположение | Начальная цена лота, бел. руб. (с НДС 20 %) | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1. | **Лот № 1. Капитальное строение** с инв. № 320/С-22610, площадью 213,6 кв. м.<br>Расположенное по адресу: г. Жлобин, ул. Молодежная, 2г.<br>Назначение – здание специализированное розничной торговли.<br>Начальная цена предмета электронных торгов – 110 815 руб. 87 коп. (с учетом НДС 20 %).<br>Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 340800000004000049 площадью 0,0747 га, (право постоянного пользования), назначение – земельный участок для обслуживания здания магазина № 52 | **110 815,87** | **11 081,59** |
| 2. | **Лот № 2. Капитальное строение** с инв. №320/С-26582, площадью 286,4 кв. м.<br>Расположенное по адресу: г. Жлобин, ул. Красная, 1.<br>Назначение – здание многофункциональное.<br>Начальная цена предмета электронных торгов – 157 137 руб. 02 коп. (с учетом НДС 20 %).<br>Зданию принадлежит согласно техническому паспорту:<br>дощатая уборная, забор деревянный, кирпичный сарай, забор на дерев. столбах, охранная сигнализация.<br>Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 340800000004000047 площадью 0,0941 га (право постоянного пользования), назначение – строительство и обслуживание магазина № 96 | **157 137,02** | **15 713,70** |
| 3. | **Лот № 3. Капитальное строение** с инв. №350/С-73301, площадью 407,2 кв. м.<br>Расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Шевченко, 9.<br>Назначение – здание специализированное склада, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ.<br>Начальная цена предмета электронных торгов – 157 810 руб. 94 коп. (с учетом НДС 20 %).<br>В том числе лоту принадлежит оборудование: система автоматической охранной сигнализации, система автоматической пожарной сигнализации, прибор учета тепловой энергии ТЭМ-1041, холодильная камера КХС, холодильная камера КХН, холодильный шкаф 1,12-ГИХ, холодильная камера КХС сплит-система KL8-218 к холодильной камере.<br>Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 340100000001001841 площадью 0,0460 га (право постоянного пользования), назначение – для содержания и обслуживание склада ОРС | **157 810,94** | **15 781,09** |

**Оператор электронной торговой площадки: РУП «Информационный центр Минэкономики», 220030, г. Минск, ул. Берсона, 1а, комн. 513, torgi.gov.by**

1. Электронные торги состоятся 08.10.2018 г. на электронной торговой площадке оператора.
2. Электронные торги проводятся в соответствии с Положением о порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, в том числе земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608.
3. Лицо, желающее принять участие в электронных торгах, аккредитованное на электронной торговой площадке, подает оператору электронной торговой площадки заявление и документ, подтверждающий внесение суммы задатка. Сумма задатка перечисляется на текущий расчетный счет BY47BLBB30120400051678001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области г. Гомель, ул. Советская, 7, БИК BLBBBY2X, УНП 400051678.
4. Последний день подачи заявлений – 07.10.2018 г.
5. В течение пяти рабочих дней после утверждения протокола победитель электронных торгов (претендент на покупку) обязан возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов.
6. После совершения победителем электронных торгов (претендентом на покупку) названных действий и представления организатору копий платежных документов, но не позднее десяти рабочих дней, с победителем электронных торгов (претендентом на покупку) в установленном порядке в соответствии с условиями электронных торгов с продавцом заключается договор купли-продажи имущества

## 20.09.2018 года в 14:00 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Академика Павлова, 6 состоятся повторные торги в форме открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ЗАО «Торговый Дом «Двина»

Организатор торгов – Миронов Николай Михайлович – ликвидатор ЗАО «Торговый Дом «Двина», 211394, г. Орша-14, а/я 4, nikolya.mironov32@gmail.com, тел. (viber) (+375 29) 692-32-26.

Продавец – ЗАО «Торговый Дом «Двина», Витебская область, г. Витебск, ул. А. Павлова, 6, тел. (+375 29) 692-32-26.

Дата, время проведения торгов – 20 сентября 2018 года в 14.00 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Академика Павлова, 6

Объявление о проведении предыдущих торгов было опубликовано в газете «Советская Беларусь» за 23.12.2017.

Объявление о проведении предыдущих торгов было опубликовано в газете «Звязда» за 21.02.2018.

Объявление о проведении предыдущих торгов было опубликовано в газете «Звязда» за 28.03.2018.

Объявление о проведении предыдущих торгов было опубликовано в газете «Звязда» за 13.06.2018.

Объявление о проведении предыдущих торгов было опубликовано в газете «Звязда» за 14.07.2018.

Форма проведения торгов – Аукцион.

Задаток должен быть внесен до подачи заявления на участие в аукционе в срок по 19.09.2018 г. Заверенный банком платежный документ прилагается к заявлению. Реквизиты для перечисления задатка: *Получатель платежа:* закрытое акционерное общество «Торговый Дом «Двина». Р/с: BY93 MMBN 3012 2007 6001 0933 0000 в ОАО «Банк Москва-Минск» г. Минск, BIC MMBNBY2, *УНП:* 300048845, *наименование платежа:* задаток на участие в аукционе.

Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона. Участнику, выигравшему торги, сумма внесенного задатка учитывается в счет исполнения обязательств по договору, заключенному на торгах.

В случае отказа или уклонения участника, выигравшего торги, от подписания протокола и (или) договора купли-продажи внесенный задаток возврату не подлежит.

Заявления на участие в аукционе принимаются с 8.00 6 сентября 2018 г. ежедневно по рабочим дням по адресу: 211394, Витебская обл., г. Орша, 3-й Заречный пер., 1А, Миронов Николай Михайлович. Заявление на участие в торгах принимаются по 16.00 19 сентября 2018 г. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие организатору торгов в установленный в настоящем извещении срок заявление (с приложением необходимых документов, установленных п. 12 Положения о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16), внесшие в установленном порядке на указанный в настоящем извещении расчетный счет сумму задатка, зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах и заключившие с организатором торгов договор о задатке.

В случае фактического отсутствия денежных средств на расчетном счете участник, подавший заявление, к участию в аукционе не допускается.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона производится победителем аукциона по фактическим затратам. Все расходы, связанные с регистрацией договора купли-продажи, оформлением перехода права собственности, несет покупатель.

В случае отказа или уклонения победителя аукциона от возмещения затрат на организацию и проведение аукциона результаты аукциона подлежат аннулированию, а внесенный им задаток возврату не подлежит.

